

ХАРЧАВАННЕ ПА ЛІЧБАВЫМ ПАШПАРЦЕ

5

ЦІ МОЖНА КІРАВАЦЬ МЫСЛЕННЕМ ЧАЛАВЕКА?

8



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 ЛІСТАПАДА 2022 г. СУБОТА № 233 (29855)

## КОРАТКА

- На рэках Беларусі адзначаецца спад узроўняў вады.
- Перасовачныя заводы МКЗ-3214 ТАА «Мабільныя камбікормавыя заводы» атрымалі рухавік беларускай вытворчасці.
- Мінсельгасхарч і кітайская кампанія абмеркавалі пастаўкі ўпаковкі малочнай прадукцыі.
- Мадэрнізаваны цэх па перапрацоўцы лёну адкрылі на заводзе ў Дуброўне.
- Беларуская чыгунка праводзіць анкетаванне сярод атрымальнікаў і адпраўшчыкаў грузаў.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Іван КУБРАКОЎ, міністр унутраных спраў:**

*«Акрамя call-цэнтраў, якія знаходзяцца ва Украіне, распрацавана цэлая сістэма навучання аператараў. Ёсць спецыяльныя вучэбныя цэнтры, якія таксама знаходзяцца ва Украіне. Тэлефонных аператараў навучаюць і тлумачаць, як размаўляць, даюць пэўныя матэрыялы і набор слоў, як у той ці іншай сітуацыі даводзіць штосьці да грамадзян Беларусі. Найбольш уразлівыя тут людзі сталага ўзросту. Праз СМІ мы даводзім гэтую інфармацыю, прыводзім канкрэтныя прыклады, але маштабы падману вельмі і вельмі велізарныя. Толькі сёлета ўрон, нанесены ад гэтай катэгорыі махлярстваў, склаў $4,5 млн. Такой колькасцю грошай на тэрыторыі Беларусі завалодалі ашуканцы, якія знаходзяцца ва Украіне. Мы даводзім лічбы, расказваем нашым людзям. На жаль, часам грамадзяне не чуюць гэтага».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ПАТРЭБНЫ КАНКРЭТНЫ ПЛАН І АДКАЗНЫЯ ЛЮДЗІ. КАЛІ ГЭТАГА НЕ БУДЗЕ — МАРНАЯ РАЗМОВА І БЕСПРАСВЕТНАЯ БУДУЧЫНЯ»



Фота БелТА.

**Развіццё аграпрамысловага комплексу Гомельскай вобласці, яго праблемы і перспектывы абмеркавалі на нарадзе ў аблвыканкаме з удзелам Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Дадзены рэгіён знаходзіцца на асаблівым кантролі кіраўніка дзяржавы. Менавіта Гомельшчына найбольш пацярпела ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Для ліквідацыі наступстваў дзяржава дзесяцігоддзямі ўкладала вялікія сродкі. Але, тым не менш, Гомельшчына паказвае самыя нізкія вынікі работы аграпрамысловага комплексу. На гэта ёсць аб'ектыўныя (кліматычныя) прычыны, але справа не толькі ў іх.**

«Хачу адразу папярэдзіць: размова мае быць сур'ёзная. Таму ўспрымайце яе, нават жанчыны, па-мужчынску і без крыўдаў», — адразу задаў тон нарады кіраўнік дзяржавы. «Кожны з вас пасля гэтай сустрэчы павінен вярнуцца ў свой раён ці гаспадарку, каб працаваць шмат і напружана. З поўнай самааддачай. І патрабаваць таго ж ад падначаленых. Па-іншаму пераламаць негатыўныя тэндэнцыі ў рабоце рэгіёна не атрымаецца», — дадаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што на нядаўнім саміце АДКБ у Ерэване, дзе абмяркоўваліся ваенна-палітычныя пытанні, праблемам харчавання і харчовай бяспекі таксама ўдзялілі шмат увагі. Усе кіраўнікі дзяржаў казалі менавіта пра тое. «Гэта сведчыць аб тым, што ў свеце вельмі сур'ёзная напружанасць з харчаваннем. І ўсё гэта будзе нарастаць», — адзначыў беларускі лідар.

## ШТО НА КЛІМАТ НАРАКАЦЬ...

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу: сёлета ўся краіна працавала на ўраджай, і атрымаўся дастойны вынік. «Які ўклад Гомельшчыны ў агульны каравай? На жаль, ганарыцца няма чым. Мільённы рубеж пераадолелі толькі з кукурузай. А што па мясе, малаку? Уся краіна рухаецца наперад, а вы — уніз!» — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання дакладвае: калі б Гомельская вобласць дасягнула хоць бы ўзроўню мінулага года (нават без росту), краіна ў сельскай гаспадарцы выканала б пастаўленую задачу (рост да 104 працэнтаў). Ён падкрэсліў, што з-за такога падыходу Гомельскага аграпрама ўпушчаная выгада склала каля 100 мільёнаў рублёў. Грошы немалыя. Асабліва сумна, заўважыў Прэзідэнт, што падобная сітуацыя ў рэгіёне не толькі сёлета. ***«Усе вашы адгаворкі ведаю загадзя: надвор'е (то засуха, то дажджы), бальнасць зямлі нізкая (пяскі і вецер), то яшчэ якая зараза. Хачу сказаць: не толькі вы наракаеце на гэтыя акалічнасці. Усюды наракаюць. Але не ўсюды такі вынік, дакладней, яго адсутнасць, як у Гомельскай вобласці.*** Я зямны чалавек і разумею, што ёсць аб'ектыўныя, незалежныя ад нас фактары. Так, аб'ектыўныя фактары ёсць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Але ў той жа час Прэзідэнт задаў лагічныя пытанні. Ці ўлічваюць на Гомельшчыне мясцовыя асаблівасці складу глебы, ці ўмеюць падладжвацца пад кліматычныя ўмовы? Па яго словах, гэтыя кліматычныя ўмовы не нечакана зваліліся на галаву. Таксама кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, наколькі аператыўна прымаюцца рашэнні па пераходзе да аптымальнай структуры пасяўных плошчаў, а таксама што думаюць навукоўцы аб сельскагаспадарчых рэзервах вобласці.

## «ДАЛЕЙ ТАК ЖЫЦЬ НЕЛЬГА, І МЫ НЕ БУДЗЕМ ТАК ЖЫЦЬ»

«Я хачу вас па-сяброўску папярэдзіць. Надыходзячы 2023 год для вас — лакмусавая паперка: ці вы зможаце нешта зрабіць, ці мне давядзецца думаць, што рабіць з Гомельскай вобласцю. Далей так жыць нельга, і мы не будзем так жыць, гэта дакладна. У мяне ёсць, вядома, варыянты: што зарабілі, тое і атрымалі. Мы будзем вас да гэтага падводзіць. ***Я не магу браць з іншых галін грашовыя рэсурсы і перакідваць у Гомельскую вобласць. Думайце, як вы будзеце жыць, зарабляць для таго, каб дастойна выглядаць»***, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама пацікавіўся, як ідуць справы з тым, на што ўплывае чалавечы фактар: захаванне тэхналогій, унясенне ўгнаенняў, структуры пасеваў, недапушчэнне падзяжу жывёлы, рознага роду хлусні, якая мяжуе з крыміналам, падрыхтоўка і захаванасць сельгастэхнікі. ***«Перш чым марыць аб вялікім, трэба ўзяць тое, што на паверхні. А гэта звязана з чалавечым фактарам. Нават у элементарным — у працоўнай і выканальніцкай дысцыпліне, прытрымліванні літары закона»***, — заявіў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што спецыяльна запрасіў прадстаўніка Генеральнай пракуратуры, каб наглядна і на прыкладах паказаць, як у Гомельскай вобласці працуюць кіраўнікі і што ім замінае. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што практычна ва ўсіх правераных гаспадарках выяўляюцца парушэнні пры вырошчванні жывёлы. У кожнай чацвёртай устаноўлены факты прадстаўлення недакладнай інфармацыі аб яе падзяжы. Траціна арганізацый дапускае парушэнні тэхналогіі закладкі кармоў, а потым з-за гэтага скаціна гіне. «На месцах бедлам! Хранічныя прыпіскі і крадзеж!» — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў: ён сам практык і ведае, што такое статыстыка і справаздача. «Любая ваша справаздачнасць, статыстычная справаздачнасць — найважнейшы элемент у кіраванні дзяржавай. Але я не разумею, навошта вы хлусіце. Каму патрэбна тая хлусня, лёгка праверыць», — заўважыў ён.

СТАР. 2

Беражыце сябе!

# ХРУСТАЛЬНЫ ГОРАД

**Дробны ледзяны дождж цягам двух дзён глазуруе вуліцы абласнога цэнтра. Барацьба невялікага тэмпературнага мінуса і адлігі ператварыла гарадскія дарогі ў суцэльны каток. Праезджую частку камунальныя службы пачысцілі добра, а вось са слізгатой пешаходных шляхоў вялікага горада пакуль не спраўляюцца. Галалёдзіца значна дадала работы і гомельскім медыкам. Другі дзень асабліва напружанае дзяжурства нясуць спецыялісты траўматалагічнага пункта Гомельскай гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі.**

— З улікам умоў надвор'я, якое склалася цяпер у горадзе, колькасць пацыентаў з галалёднымі траўмамі павялічылася як мінімум у паўтара раза. Калі яшчэ некалькі дзён таму за змену прымалі да 40 пацыентаў з траўмамі, то гэтымі днямі не менш за 100, — паведамляе **ўрач траўматолаг-артапед па аказанні хуткай меддапамогі Андрэй МАЛАШАНКА**.

Звяртаюцца па дапамогу пасля падзення не толькі састарэлыя, але і маладыя, і людзі сярэдняга ўзросту. На калідоры ў чаканні прыёму доктара адны жанчыны, але гэта не значыць, што мужчыны гэтымі днямі абышліся без траўмаў. Медыкі заўважаюць, што моцны пол проста менш удзяляе ўвагі наступствам падзення. Як зразумець, што неабходна звярнуцца да медыкаў?

— Ацаніце свой фізічны стан здароўя, наяўнасць болевага сіндрому. Калі вас нешта насцярожвае, то варта неадкладна звярнуцца па меддапамогу ў траўматалагічны пункт самастойна ці выклікаць «хуткую», — звяртае ўвагу Андрэй Малашанка.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

22233>

Кожны дзень – з любімай «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2023 г., — у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# «ПАТРЭБНЫ КАНКРЭТНЫ ПЛАН І АДКАЗНЫЯ ЛЮДЗІ. КАЛІ ГЭТАГА НЕ БУДЗЕ — МАРНАЯ РАЗМОВА І БЕСПРАСВЕТНАЯ БУДУЧЫНЯ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік дзяржавы расказаў, што, накіроўваючы Івана Крупко на пасаду старшыні аблвыканкама Гомельскай вобласці, думаў: жалезнай рукой навядзе парадак, возьмецца за справу і паверне да лепшага, найперш у сельскай гаспадарцы. Івана Крупко Прэзідэнт назваў кіраўніком ад зямлі. Ён працаваў у калгасе, узначальваў пасяховыя раёны Міншчыны, а затым працаваў міністрам сельскай гаспадаркі і харчавання. Ёсць усё неабходнае: досвед, кампетэнцыі. «Ёсць веды, я гэта бачыў. Што вам яшчэ трэба? Якога найлепшага кіраўніка я магу вам накіраваць? Значыць, шмат што залежыць ад вас, як вы вакол яго станеце і будзеце цягнуць гэты цяжкі груз», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## «СВАБОДА І НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ — ГЭТА МАГЧЫМАСЦІ»

Па словах беларускага лідара, час вельмі сур'ёзны. І востра стаіць пытанне: ці мы застаёмся дзяржавай, ці нам трэба думаць пра іншыя варыянты: ***«Мы недарма 30 гадоў песцілі і няньчылі гэтую дзяржаву, для таго, каб хоць бы нашы дзеці жылі свабодна і незалежна. Калі хтосьці разумее свабоду і незалежнасць, «што я хачу, тое і раблю: хачу — працую, хачу — не» — ні ў адной дзяржаве гэтага няма і не будзе. Свабода і незалежнасць — гэта магчымасці»***. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў яго не было багатых сваякоў, а яго дзяцінства прыйшлося на цяжкія гады ў вёсцы. І тады дарослыя людзі, па словах Прэзідэнта, яго маці марылі, каб дзеці атрымалі годную адукацыю, каб мелі роўныя магчымасці з дзецьмі палкоўнікаў, генералаў, прафесараў і гэтак далей.

«Мы, што, гэтага людзям не далі сёння? Далі, нават больш за тое, разумеючы, што ў вёсцы сёння складаней у адукацыі, у палове ВНУ ўвялі па мэтавых напрамках адукацыю. Ідзіце, калі ласка, вучыцеся, такога ў Савецкім Саюзе не было. Мы з глыбінкі, Гомельскай вобласці, так званых чарнобыльскіх раёнаў падтрымліваем дзяцей. ***Вашы дзеці, калі хоць крыху галаву ў руках трымаюць, маюць неабмежаваныя магчымасці і каласальную падтрымку найперш з боку Прэзідэнта. Што яшчэ трэба? Жадаеце пад бізуном пахадзіць — пахадзіце. Але гэта ўжо без мяне. Тады з вамі размаўляць у такім складзе ніхто не будзе: возьмуць бізуны і будзеце бегчы, скапыціцеся, адстанеце — вы ведаеце,*** што будзе. З намі ўжо было гэта 80 гадоў таму, нам паспрабавалі гэта прадэманстраваць. Тады па Беларусі прайшліся так, што мы да гэтага часу чхаем і рыдаем», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён канстатаваў, што менавіта так востра стаіць пытанне. І ў Гомельскай вобласці гэта адчулі асабліва востра. «Не хочацца, каб нашы дзеці ўзялі зброю і пайшлі абараняць сваю краіну. Мне гэта абсалютна не захочацца. Калі камусьці хочацца — устаньце і скажыце, мы забяспечым. Лепш давайце мы будзем, сціснуўшы зубы, працаваць і выдаваць вынік», — эмацыянальна выказаўся Прэзідэнт.

## «МОМАНТ ІСЦІНЫ ЗАРАЗ»

Па словах кіраўніка дзяржавы, сёлета ў краіне цудоўны вынік у сферы аграпрамысловага комплексу. Раней не ведалі, што рабіць, куды прадаць. Сёння — толькі дай за добрыя грошы. «Дык прадайце, вазьміце грошы і рабіце ў Гомельскай вобласці. Вам ніхто не перашкаджае, а я буду толькі вас абараняць, каб вам ніхто не перашкаджаў. Вы зарабіце гэтыя грошы. Сёння ёсць гэта ўсё. Я нядаўна казаў на сустрэчы з прадстаўнікамі аграпрамысловага комплексу: ніколі не было такіх умоў і не будзе. ***Вазьміце тое, што ляжыць. Падыдзіце, нават не нагінайцеся і вазьміце. Вы чамусьці разгойдваецеся, думаеце, што будзе і далей так. Момант ісціны зараз. Рынкі — вязі куды хочаш. І не толькі ў Расіі — Кітай гатовы спажыць колькі заўгодна прадукцыі»***, — сказаў беларускі лідар. Як інфармуюць Прэзідэнта, сёння пасрэднікі, нейкія гандлёвыя дамы купляюць беларускую прадукцыю за два рублі, а рускаму чалавеку прадаюць за дзевяць. «Я падазраю, што стаіць задача выпхнуць прадукцыю за вароты завода ці калгаса, саўгаса. Не, дарагія мае. ***Рынак нікуды не падзеўся, ён працуе, таму трэба ўзяць масла, сыры і паспрабаваць рускаму чалавеку ці кітайцу гэта прадаць прама ў рукі.*** А для гэтага трэба мець свае крамы там, сваю сетку ці ўвайсці ў іх сетку. Вам трэба варушыцца, каб годна выглядаць і мець грошы. Сёння можна атрымаць грошы. І працы ў нас дастаткова», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка.

Нядаўна на ўзроўні Прэзідэнта абмяркоўвалася пытанне меліярацыі. Па яго словах, меліярацыя для Гомельшчыны — найважнейшае пытанне, а для гэтага трэба грошы. «І не думайце, што Мінпрам зробіць вам усё, што вы хочаце, за бясплатна. Не будзе гэтага. За ўсё трэба плаціць, і зараз — шанц. Вы думалі перад прыездам Прэзідэнта, як будзеце жыць і працаваць. Думаю, што прыдумалі. Тое, што недадумалі пасля нашай размовы да вясны, прыдумаеце зыходзячы з рэалій», — адзначыў беларускі лідар.

## «ГАЛОЎНАЕ — ВАРУШЫЦЦА І ДЗЕЙНІЧАЦЬ»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу і на кадравую палітыку. Ён адзначыў, што, сустракаючыся з вертыкаллю ўлады, просіць кіраўнікоў не секчы з пляча, даць шанц працаўнікам. Але гэты шанц сёння не можа доўжыцца год, нават паўгода. Час спрэсаваны, свет ашалеў, усё спрэсавана. «Квартал папрацаваў — бачыце, што не цягне чалавек, прычыны розныя — знайдзіце яму іншую працу. Але калі ён сябе паводзіць варожа, вы ведаеце, што рабіць. Нядаўна па кадрах прыняты мае рашэнні, аблвыканкамы павінны выпрацаваць сістэму кадравай палітыкі. ***Працуеш — вось табе ўсе даброты, гонар і слава. Калі не хочаш працаваць — паспрабуем цябе навучыць або прымусіць. Калі зусім няздольны, ну хлопец ці дзяўчына, сыходзьце ў бок, бярыце мятлу і мяціце, калі не можаце быць кіраўнікамі або спецыялістамі»***, — сказаў Прэзідэнт. Па яго словах, гэта нават не варта абмяркоўваць.

***«Без дысцыпліны і парадку тэхналогій, тэхналагічнай дысцыпліны няма чаго казаць***, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Калі вы да гэтага часу не прыбралі кукурузу, на якую вы моліцеся ў Гомельскай вобласці, калі вы самому не звезлі з палёў, яна ў вас у валках пасля камбайна стаіць, і не ўзаралі там тысячы гектараў зябліва, марыць аб тым, што вы рванеце ў раслінаводстве ў наступным годзе не варта. Улічваючы вашу разбоўтанасць і злачыннае стаўленне да некаторых пытанняў, крадзеж і ашуканства. Падумайце над тым, што я сказаў. Прымайце кадравыя рашэнні, забяспечвайце паступальны рух наперад», — запатрабаваў кіраўнік краіны.

Нядаўна былі прызначаны кіраўнікі шэрагу раёнаў Гомельскай вобласці. Прэзідэнт выказаў спадзяванне, што гэтыя людзі будуць працаваць як трэба. Па яго словах, галоўная выснова нарады ў Гомельскім аблвыканкаме заключаецца ў тым, што больш угавораў і размоў з гамяльчанамі, магілёўчанамі, віцябчанамі не будзе. Усе ведаюць, што рабіць. Тым, хто не ведае, кіраўнік дзяржавы параіў успомніць мінулае. Ён сарыентаваў, што галоўнае — варушыцца і дзейнічаць.

Беларускі лідар канстатаваў, што патрэбны план, дзе будзе дэталёва прапісана ўсё да дробязяў: мерапрыемствы, адказныя, тэрміны, рэсурсы. Такі план развіцця аграпрамысловага комплексу Гомельскай вобласці павінен ляжаць на стале віцэ-прэм'ера і міністра сельскай гаспадаркі. Тое ж самае і па іншых абласцях. Аляксандр Лукашэнка прывёў для прыкладу Віцебскую вобласць, дзе знайшлі свой варыянт развіцця аграпрамысловага комплексу — стварылі інтэграцыйныя структуры. Па яго меркаванні, такі вопыт можа быць запатрабаваны і на Гомельшчыне.

***«Патрэбны канкрэтны план і адказныя людзі. Калі гэтага не будзе — марная размова і беспрасветная будучыня заўтра. Яшчэ раз гавару: парадак, дысцыпліна і дыктатура тэхналагічная. Кожны работнік мясцовай вертыкалі павінен дакладна разумець сваю ролю і меру адказнасці. Толькі так мы атрымаем рэзультат»***, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

## ЖАЛЕЗНАЯ ВЫКАНАЛЬНІЦКАЯ ДЫСЦЫПЛІНА

Удзельнікі нарады з усіх бакоў разгледзелі сітуацыю ў Гомельскай вобласці. Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Ігар Брыло далажыў аб стане спраў у сельскай гаспадарцы Гомельскай вобласці і яе ўкладзе ў развіццё аграпрамысловага комплексу краіны. Аб законнасці ў сельскай гаспадарцы рэгіёна расказаў намеснік Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь Максім Варонін. Дырэктар Рэспубліканскага навуковага дачыннага прадпрыемства «Інстытут глебазнаўства і аграхіміі» Юрый Шашко расказаў аб напрамках развіцця земляробства ў Гомельскай вобласці з улікам кліматычных змяненняў. Старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван Крупко прадставіў стратэгію развіцця аграпрамысловага комплексу свайго рэгіёна. Так, у 2023—2025 гадах плануецца павялічыць аб'ём валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі да ўзроўню 2022 года на 35,7 працэнта (раслінаводства — на 48,2 %, жывёлагадоўлі — на 27,6 %).

Па словах кіраўніка дзяржавы, праблемы рэгіёна знаходзяцца на ўзроўні Прэзідэнта ўжо даўно. І іх трэба неадкладна вырашаць. У першую чаргу — у інтарэсах саміх гамяльчан. ***«Вы бачыце, што на поўдні робіцца. Вы таксама так хочаце? Я не хачу. І пакуль у мяне ўлада, мы забяспечым тое, што павінна быць у Гомельскай вобласці»***, — заявіў ён.

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на так званае прыгоннае права на кадрах. Маюцца на ўвазе выпадкі, калі чалавек атрымаў адукацыю за кошт дзяржавы, папрацаваў ветурачом, заатэхнікам, аграномам, кіраўніком і назаўтра пайшоў да камерсанта, дзе прывольна сябе адчувае. «Дык вось, гэтага больш не будзе. У гэтым сутнасць», — канстатаваў Прэзідэнт, папярэдзіўшы, што патрабаванне за тое з губернатараў і ўпаўнаважаных будзе жорсткае.

«Вам сказана паставіць на ўлік кожнае цяля — пастаўце і захавайце. Але калі яно загінула — адлюструйце ў справаздачнасці. Вам намечана схема пастаўкі малака, мяса на перапрацоўку — аддайце тое, што намечана. Што звыш — хай прадаюць. Колькі можна казаць аб дысцыпліне кадраў. Навошта вы гэтымі прыпіскамі займаецеся? ***Ну, добра, прыпісалі, перааралі 200 гектараў, а не 250. Дрэнна, але не катастрофа. Але калі вы загубілі жывёлу і яшчэ прыпіскамі займаецеся і заробак плаціце людзям за гэтыя прыпіскі — гэта ўжо бандытызм найвышэйшай ступені.*** І пра гэта мы павінны скончыць гаворку сёння па ўсёй краіне», — звярнуўся беларускі лідар да прысутных кіраўнікоў раёнаў і гаспадарак. Ён растлумачыў, што рэагуе на тое не таму, што Прэзідэнт. А таму, што праз гэта можна страціць краіну. Усё пачынаецца з-за бязладнасці, безадказнасці.

## «ТРЭБА ПРОСТА ПРАЦАВАЦЬ»

Кіраўнік дзяржавы запытаў, каго з кіраўнікоў гаспадарак Гомельскай вобласці можна прывесці ў прыклад. Такім чалавекам стала кіраўнік гаспадаркі «Атор» Чачэрскага раёна Таццяна Струк. Аляксандр Лукашэнка папрасіў яе падзяліцца з удзельнікамі нарады сакрэтам поспеху і расказаць, што трэба рабіць у АПК рэгіёна, каб больш не мець такой размовы.

***«Трэба проста працаваць. Рабіць сваю справу, любіць сваю справу, любіць зямлю, на якой мы працуем. І ўсё наладзіцца.*** Гэта добрая тэма, што пачалі маладых кіраўнікоў вучыць. Але павінна ў чалавека быць тое, што закладзена яшчэ ў сям'і. Гэта адказнасць, працаздольнасць. Хоць трэба ўважліва працаваць і з арганічнымі ўгнаеннямі, даць матухне-зямлі тое, што трэба даць, каб атрымаць сапраўды высокі ўраджай», — адказала Таццяна Струк.

Прэзідэнт заўважыў, што яна вельмі сцісла сказала пра клімат. А на першым месцы — зноў жа людзі. Па словах кіраўніка дзяржавы, гэта правільна. У любых кліматычных умовах усё залежыць ад людзей: «А што датычыцца кадравай палітыкі, людзей менш не стала. Проста занадта дэмакратызаваліся. Часам падказкі былі з боку. Цяпер мы бачым, да чаго гэта прывяло. З іншага боку, самі: рынак усё вызначыць. А не, таварышы, не ўсё. І калі б мы акунуліся ў гэты рынак у сярэдзіне 1990-х, мы б мелі сёння сумны выгляд. У нас бы сёння палала вайна. ***У нас сёння ідэальны шанц замацаваць сваю незалежнасць у цяжкія часы. Але толькі трэба займацца сваёй справай»***, — звярнуўся да ўдзельнікаў нарады Прэзідэнт.

## «БЕЗ ЖЫЛЛЯ, БЕЗ ЗАРПЛАТЫ — НІЧОГА НЕ БУДЗЕ»

Аляксандр Лукашэнка рэзюмаваў асноўныя пытанні, якія ўзнімаліся на нарадзе. Ён падкрэсліў, што калі вобласць просіць дзяржаву закупіць тэхніку для гаспадарак, то яна павінна гарантаваць, што гэтыя машыны будуць захоўвацца ў належных умовах. Прэзідэнт заклікаў гаспадаркі ўважліва ставіцца да тэхнікі і берагчы яе. Такі ж самы падыход павінен быць да жывёлы.

«Будзем дапамагаць па жыллі, — абазначыў кіраўнік краіны яшчэ адзін важны прыярытэт. — Я разумею, што без людзей толку не будзе, але жыллё прывязвае. Таму наконт арэнднага жылля цяпер урад выпрацоўвае падыходы ваенным, дзяржслужачым, шматдзетным і калгасам, прадпрыемствам», — сказаў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што пры такой жорсткай кадравай дысцыпліне патрэбен і пернік — гэта і будзе жыллё. Яшчэ адно пытанне — заработная плата. «Без жылля, без зарплаты — хоць памрыце — нічога не будзе. Вы людзей не ўтрымаеце, і «прыгоннае права» таксама не дапаможа», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Дапамогу з боку горада і прадпрыемстваў кіраўнік дзяржавы назваў законам. «На чым ён заснаваны? І металургічны завод, і нафтаперапрацоўка, і «Беларусьнафта», і «Гомсельмаш» — вы людзей высмакталі з вёскі, а цяпер трэба дапамагчы», — растлумачыў ён свае словы.

Прэзідэнт настойвае, што кадры трэба вучыць па розных напрамках. Эфектыўныя гаспадаркі раёна могуць паказваць, як трэба працаваць.

Беларускі лідар закрануў праблему злачыннасці і карупцыі. «Злачынствы трэба гэтыя заканчваць. Не стаўце сябе пад нож. Ніякай карупцыі ў квітнеючай Беларусі мы не дапусцім. Асабліва што датычыцца падзяжу жывёлы. Даравання гэтаму не будзе. Падзеж, кармленне жывёлы — усё трэба рабіць своечасова і правільна», — папярэдзіў ён.

Таксама Прэзідэнт заявіў, што ніякага пасрэдніцтва ў продажы сельгаспрадукцыі быць не павінна. Ён заклікаў кіраўнікоў гаспадаркі актыўна рухацца самім, адкрываць свае крамы. А дзяржава ўсяляк падтрымае такія пачынанні.

«Я вельмі хачу, каб наша сённяшняя сустрэча не ператварылася ў нейкае павучанне, лекцыю, беспрадметную размову», — падзяліўся Прэзідэнт. Па яго словах, шчасця ні з усходу і ні з захаду, ні на поўдні, ні на поўначы для Беларусі няма. Калі спатыкнёмся — усё.

«Трэба накарміць сваіх людзей і сябе. А ўсё астатняе — прадаваць і купляць тэхніку. Спуску мы нікому не дадзім. Усіх, хто працуе, сумленна будзе працаваць — убачым і падтрымаем. Давайце пачнем адзін аднаго і зробім тое, што павінны зрабіць. З любоўю. Не атрымліваецца з любоўю — тады па неабходнасці».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

*г. Гомель.*

**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО ОАО «ММЗ ИМЕНИ С.И.ВАВИЛОВА – УПРАВЛЯЮЩАЯ КОМПАНИЯ ХОЛДИНГА «БЕЛОМО»

| **ЛОТ 1** | |
|---|---|
| **Наименование** | **Характеристика** |
| **Стоянка легкового автомобильного транспорта с КПП для обслуживания физических лиц** | Стоянка легкового автомобильного транспорта с КПП для обслуживания физических лиц с инв. № 500/С-1008149.<br>Назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства.<br>Общая площадь – 4663 кв. м.<br>Год постройки – 1977.<br>Составные части и принадлежности: А – стоянка легкового автомобильного транспорта с КПП для обслуживания физических лиц, а1 – автостоянка, а2 – эстакада, а3 – ограждение, а4 – осветительная мачта, а5 – ворота, а6 – калитка, А1/к – КПП |
| **Адрес** | г. Минск, ул. Макаёнка, 23в |
| **Земельный участок** | Земельный участок с кадастровым номером 500000000009007655 площадью 0,4663 га. Целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания сооружения специализированного автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства.<br>Право временного пользования.<br>Срок действия: с 27.11.2020 по 31.10.2030 |
| **Начальная цена продажи (в т. ч. НДС 20 %)** | 470 806,13 (Четыреста семьдесят тысяч восемьсот шесть белорусских рублей 13 копеек) |
| **Задаток** | 47 080,61 (Сорок семь тысяч восемьдесят белорусских рублей 61 копейка) |
| **Шаг аукциона** | 5 % |
| **Продавец** | Открытое акционерное общество «Минский механический завод имени С.И. Вавилова – управляющая компания холдинга «БелОМО»<br>220114, г. Минск, ул. Макаёнка, 23<br>Тел. 8 (017) 215-11-90 |
| **Организатор торгов** | РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 9, каб. 7<br>Тел.: 8 (017) 324-70-57 |
| **Прием заявления** | **По 23.12.2022 до 11.00**<br>в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00<br>по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7 |
| **Условия аукциона** | 1. Победитель аукциона либо единственный участник, согласный приобрести Лот по начальной цене, увеличенной на пять процентов (далее – Претендент на покупку), обязан подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 30 календарных дней со дня проведения аукциона (после предъявления Продавцу копии платежного документа, подтверждающего оплату вознаграждения Организатору аукциона).<br>2. Лица, желающие принять участие в аукционе по продаже Лота № 1, перечисляют задаток на расчетный счет ОАО «ММЗ имени С.И. Вавилова – управляющая компания холдинга «БелОМО» р/с BY56BPSB30121030120129330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, пр-т Независимости, 32А-1, BIC BPSBBY2X, УНП 100185185, ОКПО 14541426.<br>3. Участнику аукциона, не ставшему Победителем аукциона (Претендентом на покупку), а также участнику аукциона, письменно отозвавшему заявление на участие в аукционе, либо неявки участника на аукцион ОАО «ММЗ имени С.И. Вавилова – управляющая компания холдинга «БелОМО» возвращает сумму внесенного задатка безналичным платежом в течение 5 (пяти) банковских дней от даты проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся).<br>4. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе Лота № 1 в течение 10 (десяти) рабочих дней от даты подписания договора купли-продажи.<br>5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить Организатору аукциона вознаграждение в размере 1,5 % от цены продажи Лота № 1 в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона.<br>6. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Задаток перечисляется на расчетный счет ОАО «ММЗ имени С.И. Вавилова – управляющая компания холдинга «БелОМО», УНП 100185185, ОКПО 14541426, р/с BY56BPSB30121030120129330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, пр-т Независимости, 32А-1, BIC BPSBBY2X |
| Размер штрафа в соответствии с соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона составляет 20 000,00 руб. | |
| **Аукцион состоится 27.12.2022 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4** | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – ino.by | |
| **КОНТАКТНАЯ ИНФОРМАЦИЯ ОРГАНИЗАТОРА АУКЦИОНА**<br>**8 (017) 324-70-57 • 8 (029) 356-90-03 • 8 (029) 550-09-52 • torgi@ino.by**<br>**КОНТАКТНОЕ ЛИЦО ДЛЯ ОСМОТРА ОБЪЕКТА**<br>**Боцян Александр Александрович 8 (044) 599-61-50** | |

**Могилевский филиал**
**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор аукциона)**
**извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)**

Аукцион состоится **28.12.2022 в 11.00**
по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352

**Лот № 1:**

**Изолированное помещение с инв. № 700/D-85447 – Нежилое изолированное помещение**, общ. пл. 1478,4 кв. м. **Изолированное помещение с инв. № 700/D-85854 – Изолированное помещение образовательного, воспитательного и научного назначения**, общ. пл. 744,9 кв. м. **Изолированное помещение с инв. № 700/D-85857 – Бомбоубежище**, общ. пл. 184,9 кв. м. **Изолированное помещение с инв. № 700/D-85450 – Нежилое изолированное помещение**, общ. пл 42,3 кв. м.

Обременение: аренда. Лот № 1 расположен по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Белинского, 3; 3-2, на земельном участке с кадастровым номером 740100000002000531 (площадь – 1,0722 га, право аренды, доля в праве 49/250). Отдельный земельный участок для обслуживания лота № 1 не выделен.

**Начальная цена продажи: 1 226 488,00 бел. руб. с НДС.**
Размер задатка: 122 648,80 бел. руб.

Р/с для перечисления задатков BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901. Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона **ino.by.** Доп. информацию можно получить по тел. **8029-624-26-25, Mogilev@ino.by**


Міжпарламенцкае ўзаемадзеянне

# ДАДАТКОВЫ ІМПУЛЬС СУПРАЦОЎНІЦТВА

## Парламенцкая дэлегацыя Беларусі на чале з Наталляй КАЧАНАВАЙ з першым афіцыйным візітам наведала Расійскую Федэрацыю

**Падчас двухбаковай сустрэчы Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу са Старшынёй Савета Федэрацыі Федэральнага сходу быў разгледжаны шырокі спектр тэм беларуска-расійскага супрацоўніцтва. Наталля Качанава і Валянціна Матвіенка зверылі гадзіннікі з улікам міжнароднай, палітычнай і эканамічнай абстаноўкі, падвялі вынікі зробленага, а таксама вызначылі прыярытэтныя кірункі супрацоўніцтва на будучы год. У выніку было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Саветам Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі.**

Дакументам замацоўваюцца метады супрацьдзеяння дэструктыўнаму ціску заходніх краін, гатоўнасць своечасова рэагаваць на несяброўскія дзеянні ў адносінах да Беларусі і Расіі, на парушэнне нормаў міжнароднага права. Па словах **Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталлі КАЧАНАВАЙ**, пагадненне адпавядае дасягнутаму ўзроўню стратэгічнага партнёрства Беларусі і Расіі і плённаму ўзаемадзеянню верхніх палат парламентаў, адгарне новую старонку ў адносінах паміж краінамі, надасць дадатковы імпульс супрацоўніцтву беларускіх і расійскіх заканадаўцаў.

Спікер верхняй палаты беларускага парламента падкрэсліла, што Беларусь і Расія — не проста брацкія, дружалюбныя краіны, а і стратэгічныя партнёры, якія выбудоўваюць узаемаадносіны абсалютна па ўсіх сферах жыццядзейнасці: у палітыцы, эканоміцы, гуманітарнай сферы. «Несумненна, для нас важныя міжпарламенцкія сувязі і кантакты, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Асабліва ў цяперашні час роля кожнага парламентарыя мусіць быць больш важкай, бо мы разам павінны супрацьстаяць усім выклікам, беспрэцэдэнтнай атацы, якая сёння з боку калектыўнага Захаду нацэлена на нашы краіны і народы. Гэтага дапускаць нельга, і мы павінны быць як ніколі адзіныя».

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на тое, што візіт беларускай парламенцкай дэлегацыі адбываецца ў год 30-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Расіяй. «30 гадоў таму былі прынятыя абсалютна правільныя рашэнні, якія даюць сёння свае вынікі, — упэўнена Наталля Качанава. — Мы сапраўды сур'ёзна прасунуліся ў інтэграцыйных працэсах дзякуючы прынятым 28 праграмам, якія былі зацверджаны на Вышэйшым дзяржсавеце ў лістападзе 2021 года. І сёння гэтыя праграмы — ужо рэальнасць. Звыш 50 % з іх ужо рэалізаваны».

Аб высокім узроўні двухбаковага ўзаемадзеяння сведчыць і тое, што расійскія дэлегацыі рэгулярна наведваюць Беларусь, як і беларусы з працоўнымі візітамі нярэдка бываюць у Расіі. Рэалізоўваюцца і прынятыя рашэнні на апошнім Форуме рэгіёнаў, які адбыўся ў Гродна. У развіццё 28 саюзных праграм ужо прымаюцца законапраекты.

Танальнасць у адносінах паміж беларускімі і расійскімі парламентарыямі, па словах Старшыні Савета Рэспублікі, задаюць прэзідэнты дзвюх краін. «Іх добрыя, сяброўскія адносіны нацэлены на тое, каб захаваць свае краіны і народы суверэннымі і незалежнымі, — акцэнтавала ўвагу Наталля Качанава. — Нам пашанцавала, што ў нас такія кіраўнікі дзяржаў, якія думаюць аб будучыні свайго народа і прымаюць абсалютна правільныя рашэнні, якія накіраваны на карысць нашых краін. Бачачы, як выбудоўваюцца гэтыя ўзаемаадносіны, вядома, мы павінны працаваць эфектыўна, інтэнсіўна для таго, каб нашы краіны развіваліся ў гэтых няпростых умовах санкцыйнага ціску».

Кажучы аб сумесным праекце Савета Федэрацыі і Савета Рэспублікі «Цягнік Памяці», Наталля Качанава адзначыла, што работа ў гэтым кірунку будзе працягвацца. «Для таго, каб патрыятызм, пачуццё гонару за свае краіны, за наш савецкі народ, які ў час Вялікай Айчыннай вайны адстаяў свабоду і незалежнасць нашых краін, не сышлі ў нябыт, — заўважыла яна. — Гэта тое, што сёння з'яўляецца падмуркам нашых адносін, бо калі моладзь будзе ведаць гістарычную праўду, цаніць, ганарыцца сваім мінулым, то, несумненна, у нашых краін будзе цудоўная будучыня».

Аб тым, што ў сучасных умовах узаемадзеянне Беларусі і Расіі набывае яшчэ большае значэнне, Наталля Качанава заўважыла і падчас сустрэчы са старшынёй Дзяржаўнай Думы Расійскай Федэрацыі Вячаславам Валодзіным. «У Беларусі і Расіі назіраецца добрая дынаміка ў развіцці, — адзначыла яна. — Мы ўсё можам зрабіць самі, у нас для гэтага ёсць усе магчымасці, і мы не павінны ні ад кога залежаць. А ў тым, што Беларусь і Расія заўсёды будуць разам, няма ніякага сумнення».

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

Прыярытэты

# ТЭГЕРАН, ДАМАСК, СОЧЫ

## Урадавая дэлегацыя здзейсніла маштабны візіт

**На гэтым тыдні ўрадавая дэлегацыя Беларусі на чале з прэм'ер-міністрам Раманам Галоўчанкам наведала Іран, Сірыю, а таксама Краснадарскі край (Расійская Федэрацыя), паведаміла БелТА. Вынікам маштабнага па ахопе візіту сталі сустрэчы на вышэйшым узроўні, важныя дамоўленасці і, адпаведна, пашырэнне супрацоўніцтва.**

### НА НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ

Падчас візіту ў Іран беларуская ўрадавая дэлегацыя ўзяла ўдзел у беларуска-іранскім бізнес-форуме, наведала шэраг прадпрыемстваў Ірана, а таксама правяла перагаворы, па выніках якіх былі падпісаны дагаворы аб супрацоўніцтве. Раман Галоўчанка правядзе афіцыйныя перагаворы з Прэзідэнтам Ірана Эбрахімам Раісі, а таксама з першым віцэ-прэзідэнтам краіны Махамадам Махберам.

Пазіцыі Беларусі і Ірана супадаюць па ўсім коле актуальных пытанняў эканамічнага парадку дня. Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі падчас сустрэчы з Прэзідэнтам Ірана Эбрахімам Раісі. «Мой візіт праходзіць у выкананне даручэння Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, які пасля сустрэчы з вамі на палях саміту ШАС у Самаркандзе даручыў ураду Беларусі прааналізаваць ужо дасягнуты вынік беларуска-іранскага супрацоўніцтва і падрыхтаваць новы ўсёабдымны план яго развіцця», — звярнуўся прэм'ер-міністр да Ібрахіма Раісі.

Беларусь і Іран маюць намер вывесці адносіны на якасна новы ўзровень, заявіў Эбрахім Раісі. «Паміж нашымі краінамі заўсёды былі добрыя, моцныя і дружалюбныя адносіны», — адзначыў Прэзідэнт Ірана.

### ПУНКТЫ РОСТУ

Беларусь і Сірыя знайшлі новыя пункты росту ў двухбаковых адносінах. Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі на сустрэчы з Прэзідэнтам Сірыі Башарам Асадам. «Цяпер вельмі важна кансалідаваць усіх нашых сяброў. У такім кантэксце мы разглядалі і наш візіт у Сірыйскую Арабскую Рэспубліку па запрашэнні прэм'ер-міністра краіны. Мы правялі вельмі плённую сустрэчу. Абмеркавалі ўсё, што адбываецца ў двухбаковых адносінах і, на мой погляд, самае галоўнае, — знайшлі новыя пункты росту», — канстатаваў Раман Галоўчанка.

«Гэта толькі пачатак. За два дні мы падпісалі даволі шмат пагадненняў. Я мяркую, што неабходна сканцэнтравацца на некалькіх асноўных і дабіцца іх прадметнай рэалізацыі», — сказаў Башар Асад. У Сірыі і Беларусі ёсць вялікі патэнцыял для ўмацавання ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

### СУР'ЁЗНЫЯ ПРАЕКТЫ

Наша краіна мае намер рэалізаваць у Краснадарскім краі Расіі праекты ў сферы машынабудавання, заявіў прэм'ер-міністр Беларусі на сустрэчы з губернатарам Краснадарскага краю Веніямінам Кандрацьевым у Сочы. «Мы змаглі рэалізаваць сур'ёзны праект у галіне прамысловай кааперацыі. У першую чаргу я кажу аб праекце па вытворчасці трактарнай тэхнікі на старамінскай пляцоўцы. За студзень–верасень сабралі 220 машын. Да канца года зробім планавы аб'ём, на які дамаўляліся», — сказаў Раман Галоўчанка. Ён падкрэсліў, што гэта не адзіны сумесны праект, а проста добры прыклад, як пры падтрымцы ўладаў краю атрымаўся выгадны прамысловы праект і для беларускага боку, і для расійскага рэгіёна. «Мы і далей жадаем ісці па такім жа сцэнарыі, у прыватнасці, выйсці на вытворчасць камбайнаў, збожжаўборачнай, кормаўборачнай тэхнікі, а таксама спецыяльнай тэхнікі на базе шасі Мінскага аўтамабільнага завода», — заявіў прэм'ер-міністр.

Падпісаны пагадненні з буйнымі прамысловымі прадпрыемствамі, у прыватнасці, як распавёў кіраўнік беларускага ўрада, кантракт паміж ТАА «МАЗ» і мясцовым вытворцам па пастаўках шасі для ўстаноўкі на іх самазвальных платформаў пад перавозку збожжа. Мінскі трактарны завод і Гандлёвы дом «МТЗ – Паўночны Захад» падпісалі дагавор на пастаўку 350 трактаракамплектаў.

«Мы ганарымся вынікам сумеснай работы з Мінскім трактарным заводам. І гэты вынік вельмі своечасовы, асабліва для Краснадарскага краю, які з'яўляецца жытніцай Расіі, яе гарантам харчовай бяспекі», — сказаў Веніямін Кандрацьеў. Паводле яго слоў, Кубань — край высокатэхналагічнай сельскай гаспадаркі. «Вялікія ўраджаі, якія ў нас збіраюцца, немагчымыя без сучаснай сельгастэхнікі», — акцэнтаваў увагу губернатар Краснадарскага краю.

У студзені–верасні 2022 года тавараабарот Беларусі з Краснадарскім краем склаў \$385,5 млн і ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года павялічыўся на 63,8 працэнта. Экспарт — \$268 млн (рост на 57,6 працэнта), імпарт — \$117,5 млн (рост на 79,8 працэнта). Сальда дадатнае — \$150,5 млн.

**Пётр ДУНЬКО.**

Эканамікс

# МІЛЬЯРД РУБЛЁЎ І 500 РАБОЧЫХ МЕСЦАЎ

## З такімі вынікамі спрацаваў у Магілёве XIII Міжнародны эканамічны форум «Млын поспеху»

**Прымеркаваныя да форуму мерапрыемствы праходзілі ў абласным цэнтры тыдзень, увора адбыліся яго галоўныя падзеі і падвядзенне вынікаў.**

У рабоце форуму ўзялі ўдзел прадстаўнікі 20 краін, у тым ліку Расіі, Кітая, Казахстана, Таджыкістана, Узбекістана, Азербайджана, Палесціны, Пакістана, Сірыі, Венесуэлы, В'етнама. Беларускі бок прадстаўлялі кіраўніцтва абласных і рэспубліканскіх органаў улады, Беларускага фонду фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў, СЭЗ «Магілёў», прадпрыемстваў і арганізацый. Усяго ў форуме ўдзельнічала больш за паўтысячы чалавек.

Тэматычным напрамкам дыялогавай пляцоўкі Магілёўскага рэгіянальнага форуму па ўстойлівым развіцці стала цыркулярная эканоміка (эканоміка замкнёнага цыкла), якая выступае важным інструментам забеспячэння ўстойлівага развіцця і экалагічнай бяспекі. Яе ўдзельнікі разгледзелі міжнародныя і рэгіянальныя трэнды развіцця цыркулярнай эканомікі, ход рэалізацыі Стратэгіі ўстойлівага развіцця Магілёўскай вобласці ў 2022 годзе, а таксама прэзентавалі Стратэгію ўстойлівага развіцця Бабруйска на перыяд да 2035 года.

Удзельнікі бізнес-форуму «Вецер поспеху» абмеркавалі меры дзяржпадтрымкі бізнесу, крэдытную палітыку, небанкаўскія інструменты фінансавання, магчымасці кааперацыі буйных прадпрыемстваў і малога бізнесу. Былі прадстаўлены сучасныя трэнды ў лічбавізацыі, маркетынгу, лагістыцы і сферы бяспекі кампаній.

Тэмай разгляду ўдзельнікаў трэцяй дыялогавай пляцоўкі «Інвестыцыі як залог нашай будучыні», якая прайшла на базе Адміністрацыі СЭЗ «Магілёў», сталі спосабы пераадолення негатыўных наступстваў санкцыйных абмежаванняў з дапамогай Беларускай універсальнай таварнай біржы, імпартазамяшчэння, вырашэння лагістычных праблем, а таксама магчымасці інвестыцыйнага развіцця з улікам сучасных выклікаў. Падчас пасяджэння адбылася прэзентацыя Канцэпцыі добраўпарадкавання часткі магілёўскага гарадскога парку ў Падмоклі ISTOK і прапаноў па рэалізацыі інвестпраектаў на дадзенай тэрыторыі. Былі прэзентаваны таксама пляцоўкі для стварэння новых прадпрыемстваў і вытворчасцяў, аб'ектаў турыстычнай інфраструктуры.

На выставе вядучых вытворцаў Магілёўскай вобласці, якая разгарнулася ў Палацы культуры вобласці, можна было азнаёміцца з дасягненнямі вядучых суб'ектаў народнага гаспадарання Магілёўшчыны і іх інвестыцыйнымі магчымасцямі.

Вынікам форуму, які быў агучаны падчас пленарнага пасяджэння, стала падпісанне шэрага пратаколаў аб рэалізацыі інвестыцыйных праектаў і намераў аб супрацоўніцтве на агульную суму мільярд рублёў са стварэннем каля 500 рабочых месцаў.

Арганізатарамі Міжнароднага эканамічнага форуму «Млын поспеху» з'яўляюцца Магілёўскі аблвыканкам і Магілёўскае агенцтва рэгіянальнага развіцця.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ХРУСТАЛЬНЫ ГОРАД

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Урач пералічвае галалёдныя траўмы, якія часцей за ўсё пагражаюць пешаходам.

Найперш — пераломы касцей рук у «тыповым» месцы: гэта адбываецца з-за рэфлекторнага імкнення падставіць рукі пры страце раўнавагі. Паступаюць таксама вельмі часта пацыенты з пераломамі галёнкаступнёвага сустава. Калі чалавек атрымаў лёгкую траўму, то пасля аказання дапамогі ў траўмапункце яго накіроўваюць на амбулаторнае лячэнне. Складаная траўма хутчэй за ўсё не абыдзецца без аперацыі і шпіталізацыі.



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

Шмат людзей з галалёднымі траўмамі паступаюць у стане шоку, спрацыца з якім дапамагае папярэдняя размова з пацыентам, што праводзіць сярэдні медперсанал.

— Апытваем, пры якіх умовах, дзе чалавек паслізнуўся, вызначаем нават вуліцу, каб пазней перадаць інфармацыю камунальнікам, — расказвае **аперацыйная медыцынская сястра Тацццяна ЗАРЭЦКАЯ**. — Важная для пацыента ў гэты момант псіхалагічная падтрымка, бо людзі настолькі баяцца болю ад выпраўлення траўміраванай канечнасці, што могуць паводзіць сябе неадэкватна.

Сіноптыкі прагназуюць працяг небяспечных умоў надвор'я і галалёдзіцу на тэрыторыі Гомельшчыны, таму варта прыслухацца да парад медыкаў. Задумайцеся перш за ўсё, ці варта выходзіць на вуліцу ў такое надвор'е. Калі ёсць магчымасць, застаньцеся дома. Асабліва гэта датычыцца пажылых. Калі вы ўсё ж такі збіраецеся выйсці ў галалёдзіцу на вуліцу, то апраніце на сябе некалькі слаёў мяккага аб'ёмнага адзення, якое змякчыць удар пры падзенні. І памятайце, што самы каварны вораг у такіх сітуацыях — спешка.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Postimees: план ЕС па ўвядзенні гранічных цэн на нафту і газ праваліўся з-за рознагалоссяў

Міністры энергетыкі краін Еўрапейскага саюза чарговы раз не змаглі дамовіцца наконт увядзення гранічных цэн на нафту і газ з Расіі, што сведчыць аб правале плана. Пра гэта піша выданне Postimees. Міністрам энергетыкі краін ЕС не ўдалося выпрацаваць адзіны дакумент і прыйсці да кансэнсусу па ўвядзенні верхняй мяжы цэн на нафту і газ з РФ. У сваю чаргу, можна казаць аб краху планаў Еўропы, бо выпрацаваць адзіную стратэгію не атрымалася, адзначылі ў публікацыі. Адны краіны палічылі прапанаваную гранічную мяжу цэн на нафту ў $65—70 за барэль занадта высокай, а іншыя — занадта нізкай. Пры гэтым некаторыя еўрапейскія дыпламаты адзначаюць, што няма сэнсу склікаць яшчэ адну сустрэчу, калі няма ніякага прагрэсу ў пытанні мяжы цаны. 24 лістапада агенцтва Reuters паведамляла, што ўвядзенне краінамі Захаду гранічных цэн на нафту з Расіі амаль ніяк не паўплывае на даходы краіны ў кароткатэрміновай перспектыве.

### Алііеў выступіў супраць удзелу Францыі ў мірным працэсе паміж Арменіяй і Азербайджанам

Прэзідэнт Азербайджана Ільхам Алііеў выказаўся супраць удзелу Францыі ў мірным працэсе паміж Баку і Ерэванам пасля абвінавачанняў у адрас азербайджанскага боку. Яго словы прыводзіць РІА «Навіны».

«Прэзідэнт Францыі Макрон у сваім інтэрв'ю раскрытыкаваў Азербайджан і абвінаваціў нас у тым, чаго мы не рабілі», — сказаў Алііеў. Ён адзначыў, што пасля гэтага ў сенат Францыі была ўнесена «абсалютна непрымальная і абразлівая» рэзалюцыя, у якой парламентарыі заклікалі ўлады краіны прызнаць незалежнасць Нагорнага Карабаха. Алііеў таксама заявіў, што ў Баку ёсць зыходны тэкст, складзены Францыяй у тандэме з Арменіяй, які поўны абвінавачванняў. «Улічваючы ўсё гэта, зразумела, што Францыя не можа прымаць удзел у мірным працэсе», — рэзюмаваў прэзідэнт Азербайджана, падкрэсліваючы, што «ні ЗША, ні Расія ніколі на афіцыйным узроўні не прымалі чыйсьці бок». Алііеў адзначыў, што запланаваная на 7 снежня сустрэча не адбудзецца, і Баку мае намер «разглядаць іншыя альтэрнатывы».

### Столтэнберг: НАТА рэзка нарасціла вытворчасць «савецкіх» боепрыпасаў для Украіны



НАТА змагло значна пашырыць вытворчасць ва Усходняй Еўропе ўзбраення савецкага ўзору, якое неабходна Украіне, заявіў генеральны сакратар арганізацыі Енс Столтэнберг напярэдадні пасяджэння кіраўнікоў МЗС краін альянсу. Паводле яго слоў, некаторыя краіны на ўсходнім флангу альянсу яшчэ маюць значныя вытворчыя магутнасці для вытворчасці такой зброі і боепрыпасаў, у якіх мае патрэбу Украіна. Столтэнберг заявіў, што большасць канфліктаў заканчваецца перагаворамі, аднак «тое, што адбываецца за сталом перагавораў, залежыць ад таго, што адбываецца на полі бою», таму, адзначыў генеральны сакратар, найлепшы спосаб павялічыць шанцы на мірнае рашэнне — гэта падтрымаць Украіну. Столтэнберг падкрэсліў, што альянс будзе падтрымліваць Украіну «столькі, колькі спатрэбіцца» і «ў доўгатэрміновай перспектыве» дапамога краіне перайсці «ад абсталявання савецкай эпохі да сучасных стандартаў НАТА». Раней генеральны сакратар НАТА Енс Столтэнберг заявіў, што рашэнне аб пастаўцы Украіне зенітных ракетных комплексаў Patriot павінны прымаць лідары краін, якія збіраюцца гэта зрабіць, а не НАТА.


Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Белцветмет», Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, 42/2, район аг. Гатово** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов: транспортные средства с пробегом**
**Месторасположение: Минский р-н, Новодворский с/с, 42/2, район аг. Гатово**

| № лота | Наименование | Инв. № | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Грузовой специальный самосвал MAZ-457043-337,** р/зн. 5МК Т 8469, 2010 г. в. | 3967 | 10 200,00 |
| 2 | **Легковой внедорожник-универсал Geely Atlas,** р/зн. 0864 МТ-5, 2018 г. в. | 4847 | 42 360,00 |
| 3 | **Легковой седан Skoda Superb,** р/зн. 2439 IC-5, 2012 г. в. | 4258 | 18 120,00 |
| 4 | **Грузопассажирский универсал Volkswagen Caddy,** р/зн. АК 0201-5, 2010 г. в. | 3987 | 14 280,00 |
| 5 | **Грузовой седельный тягач MAZ-5440E9,** р/зн. АС 3511-5, 2010 г. в. | 3975 | 7 680,00 |

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов: **www.cpo.by.** Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | 100 процентов от цены продажи предмета торгов оплачивается в течение **10 рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи |

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, штрафные санкции прописаны в соглашении о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **5–7 %** от цены продажи лотов в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 27.12.2022 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 26.12.2022 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел. (8017) 298-53-53; (8029) 690-54-09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **Добрушское районное потребительское общество** (УНП 400005661), 247070, Гомельская обл., Добрушский р-н, г. п. Тереховка, ул. Вокзальная, 47, тел. (02333) 2-30-46, в лице ликвидатора Беланова Р.Н.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены **09 декабря 2022 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Автомобиль GAZ AFIK 3309, рег. № АА4695-3, 2006 г. в., тип – грузовой специальный фургон, МКПП | 1 750,00 |
| 2 | Автомобиль UAZ-3962, рег. № ЕВ 5063, 2001 г. в., тип – грузопассажирский фургон, МКПП | 1 155,00 |
| 3 | Автомобиль ВАЗ-21074, рег. № 2921 ВК-3, 2008 г. в., тип – легковой седан, МКПП | 945,00 |
3. **Аукцион состоится 28 декабря 2022 г. в 14.30 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16,** при наличии не менее двух участников. Если заявление на участие подано только одним гражданином Республики Беларусь, право аренды земельного участка предоставляестя этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на **5 процентов.**

4. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников, подавших в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр», в указанные в извещении сроки, следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк», г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе. Кроме того, НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе (в случае непобеды на аукционных торгах).**

**Перечень документов предоставляемых участником:**

4.1. заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; **гражданам Республики Беларусь** – копия паспорта, **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность.

4.2. представители или уполномоченные должностные лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов.

5. Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права, обязанности и ответственность сторон, в процессе подготовки и проведения аукциона.

6. **Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**

6.1. В течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- произвести часть оплаты за предмет аукциона (часть оплаты – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за незавершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;
- произвести часть оплаты за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;
- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;
- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников).

6.2. После совершения победителем аукциона действий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, и представления организатору аукциона и в местный исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее двух рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона местный исполнительный комитет заключает договор аренды земельного участка.

6.3 Гомельским горисполкомом может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 28 ноября по 26 декабря 2022 г. включительно. Дни приема: *понедельник, среда, пятница* с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6, 3-14. Контактные телефоны: +375 232 30-12-46. Информация размещена на сайтах: www.geodezcentr.by, gomeloblzem.by, gki.gov.by; газета «Звязда», «Гомельские ведомости»**

**Аляксандр РАДЗЬКОЎ**

Слова пісьменніка

# РЭКТАРЫ: урыўкі з кнігі




А вось Мазырскі педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна за час свайго існавання з 1944 года праблему з педагагічнымі кадрамі ў Палескім рэгіёне вырашыў. Гэтага пытання не ўзнікала нават пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС. І тут, вядома, немалая заслуга рэктараў, многіх з якіх я асабіста ведаў.

З 1974 да 1983 года рэктарам Мазырскага педінстытута быў доктар педагагічных навук, прафесар Міхаіл Афанасьевіч Дзмітрыеў. Легендарная асоба — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, партызан-ардэнаносец, — у пасляваенны час ён настаўнічаў на Гомельшчыне, быў дырэктарам школы, загадчыкам Кармянскага раённага аддзела адукацыі. За вялікія заслугі ў навучанні і камуністычным выхаванні навучэнцаў у 1971 годзе яму было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Ён неяк прыязджаў да нас у Магілёўскі педінстытут, і мы, малодыя выкладчыкі, глядзелі на яго здалёку і з захапленнем.

З прафесарам Уладзімірам Аляксандравічам Дударэнкам, рэктарам гэтай ВНУ з 1983 да 1997 года, я ўжо быў блізка знаёмы і сябраваў перш за ўсё па агульных навуковых зацікаўленнях. Уладзімір Аляксандравіч як вучоны спецыялізаваўся ў тэорыі і методыцы навучання матэматыцы, і мы не толькі вывучалі вынікі даследаванняў адзін аднаго ў гэтай галіне, але і абменьваліся водгукамі і рэцэнзіямі на свае навуковыя артыкулы і навучальныя дапаможнікі. А калі і сустракаліся на навуковай канферэнцыі, то трымаліся адзін аднаго. Аднойчы так і здарылася на пачатку дзевяностых, у Маскве. Я прапанаваў Уладзіміру Аляксандравічу наведаць Маўзалей У. І. Леніна. Ці мала што можа з ім здарыцца пасля развалу Савецкага Саюза?! Рэктар Дударэнка ў Маўзалеі таксама ніколі не быў, і мы пасля доўга згадвалі гэта наведванне.

Прафесар Дударэнка як вучоны адчуваў у навуцы перспектыўныя кірункі даследаванняў. Напрыклад, казаў мне, што да тэставых методык адносіцца насцярожана. Але мае даследаванні па гэтых тэмах падтрымаў. На мой погляд, гэта важная якасць у працы рэктара — не перашкаджаць развіццю новых навуковых ідэй, нават калі яны табе не вельмі па душы. На гэтай пасадзе ты не толькі вучоны, але і кіраўнік велізарнага навуковага калектыву, напоўненага, як гэта і павінна быць, рознымі па значнасці і арыгінальнасці прапановамі і ідэямі.

Уладзіміра Аляксандравіча змяніў на пасадзе рэктара доктар біялагічных навук, прафесар Валянцін Васільевіч Валетаў. Я з ім пазнаёміўся яшчэ тады, калі быў першым прарэктарам Магілёўскага ўніверсітэта. Валянцін Васільевіч ужо як рэктар наведваў наш універсітэт, і мы з ім сышліся. Умее слухаць, усмешлівы, ведае сваю справу — на навакольных ён рабіў прыемнае ўражанне. А ўжо міністрам я бываў у яго ва ўніверсітэце часта. Мне там падабалася размяшчэнне кабінета рэктара — на апошнім паверсе, у вуглавым пакоі з вялікімі вокнамі і чароўным відам на Прыпяць.

Валянцін Васільевіч, нягледзячы на знешнюю добразычлівасць, рэктарам быў патрабавальным. Ён прынцыпова і патрабавальна ставіўся да працы выкладчыкаў і вучобы студэнтаў, у адпаведнасці са сваім бачаннем развіцця ўніверсітэта расстаўляў кіруючыя кадры. Зразумела, што не ўсім гэта падабалася, а адносіны ў любым прафесарска-выкладчыцкім калектыве няпростыя, і людзі там здольныя напісаць — на працу рэктара пайшлі скаргі, прычым і ў міністэрства, і ў аблвыканкам. А тут і кантракт у яго завяршыўся. Я зноў паехаў у Мазыр. Пайшлі з рэктарам па ўніверсітэце: усё дагледжана, лабараторыі абсталяваны, выкладчыкі і студэнты прывітлівыя, нам усміхаюцца, рэктара ўсе ведаюць і нязмушана з ім кантактуюць. І ён ведае кожны закутак і, як мне падалося, кожнага выкладчыка, і многіх студэнтаў. Новы вучэбна-лабараторны корпус мяне ўвогуле здзівіў. Рэктар пабудаваў яго з густам, своечасова і без напружання для міністэрства. На сустрэчы з дэканамі, загадчыкамі кафедр і вядучымі вучонымі ўніверсітэта мы гаварылі пра канкрэтныя справы, у тым ліку і праблемы. У прыватнасці, пра будаўніцтва жылля для выкладчыкаў. Рэктар і тут быў скіраваны на дапамогу ім хоць бы пры першапачатковым узносе на пакупку кватэры.

Рэктар на месцы, і пра гэта я сказаў губернатару А. С. Якабсону. Аляксандр Серафімавіч павінен быў узгадняць прадаўжэнне кантракта прафесару Валетаву.

Сказаў:

— Я з'езджу ў Мазыр, таксама пагляджу стан спраў у інстытуце.

Пасля пазваніў і сказаў толькі адно слова:

— Згодзен!

Сапраўды, што тут доўга абмяркоўваць.

Валянцін Васільевіч доўгі час працаваў навуковым супрацоўнікам у Бярэзінскім біясферным запаведніку, пасля вярнуўся ў свой родны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны, там выкладаў, загадваў кафедрай. Мне казалі, што хацеў бы вярнуцца ў сваю альма-матар, але пасля гэтыя размовы спыніў, прыкіпеў да Мазырскага ўніверсітэта. Гэта ён надаў ВНУ новае дыханне — педінстытут атрымаў статус педагагічнага ўніверсітэта.

Змяніў рэктара Валетава ўжо выпускнік Мазырскага ўніверсітэта, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт Валерый Мікалаевіч Наўнька. І ў гэтым прызначэнні адчуваецца клопат Валянціна Васільевіча пра будучыню ўніверсітэта. Валерый Мікалаевіч у сваёй роднай ВНУ пачынаў выкладчыкам, быў дэканам, пасля — прарэктарам па навуковай рабоце і такім чынам аказаўся падрыхтаваным да рэктарскай пасады.

Універсітэты Гомельскага рэгіёна вядомыя сваімі навуковымі і навучальна-метадычнымі напрацоўкамі ў нашай краіне і далёка за яе межамі. Цікава, што кіраўнікі гэтых ВНУ фарміраваліся не толькі ў сваіх альма-матар, але і «выспявалі» ў суседніх універсітэтах, здаралася, што пераходзілі туды і назад не адзін раз. Таму мне заўсёды хацелася іх называць фармацыяй па аналогіі з тымі алгебраічнымі катэгорыямі, якімі праславіўся на ўвесь свет гомельскі рэктар прафесар Леанід Аляксандравіч Шамяткоў.

...Гродзенскі ўніверсітэт імя Янкі Купалы размяшчаецца ў 46 будынках і памяшканнях па ўсім горадзе. Адкуль я ведаю гэта? Таму што з аспіранцкіх часін да яго прывязаўся. Ездзіў туды на навуковыя канферэнцыі, браў у іх водгукі і рэцэнзіі на свае артыкулы і кнігі, выступаў перад калегамі на перадабароне сваёй доктарскай дысертацыі. І пры гэтым наведваў шматлікія маленькія і вялікія вучэбныя карпусы. Пашыраючы матэрыяльную базу, рэктары гэтага ўніверсітэта забіралі ў горада ўсё, што ім прапаноўвалі: будынак палітасветы, стары клуб, вытворчыя памяшканні радыёзавода, школу, якая апусцела, і шмат што яшчэ — і прыстасоўвалі іх для вучэбных заняткаў і навуковых лабараторый. Ужо як міністр я прапанаваў рэктару прафесару С. А. Маскевічу, пасля рэктару прафесару Я. А. Роўбу, які яго змяніў, пабудаваць прыгожы галоўны вучэбны корпус. Гродзенскі ўніверсітэт, як і ўсе ВНУ гэтага горада, — наш заходні адукацыйны бастыён, таму ён нават знешне павінен выглядаць манументальна. Сяргей Аляксандравіч гэты праект пачаць не паспеў — выбраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў. А вось ужо Яўген Аляксеевіч прывёз мне намаляваны на велізарных аркушах архітэктурны праект такога галоўнага корпуса. Мы з ім на гэтай глебе нават пасварыліся. Ён мне паказаў будынак са шкла і бетону, гэтакі модны «хайтэкаўскі» падыход. Я прама заявіў, што ў такім выглядзе ніхто знешне не адрозніць, гэта заводскі цэх ці навучальная ўстанова. Я ж бачыў будынак у класічным стылі — з прыгожымі калонамі, шырокай лесвіцай, высокімі дзвярыма. Уяўляў, што перад уваходам сустракаюцца студэнты, прызначаюць там свае сустрэчы і спатканні, фатаграфуюцца на памяць каля аднаго з самых прыгожых будынкаў горада, ганарацца храмам навукі і ведаў. З часам гэты праект перайшоў у стадыю рэалізацыі, ва ўніверсітэце пачалося будаўніцтва першага будынка навукова-тэхнічнага парка, але на яго архітэктурны праект я ўжо паўплываць не мог.

Усіх рэктараў Гродзенскага ўніверсітэта, пачынаючы з прафесара Аляксандра Васільевіча Бадакова, я ведаў асабіста. Сярод іх ёсць і мае блізкія сябры. Знаёмства з Аляксандрам Васільевічам спачатку было завочным, але грунтоўным. У студэнцкія гады я вучыўся філасофіі па яго навучальным дапаможніку «Дыялектычны матэрыялізм». І тая кніга мне падабалася: яснае, даступнае выкладанне ўсіх асноўных філасофскіх катэгорый. Я пасля выкарыстоўваў гэты дапаможнік нават для падрыхтоўкі да кандыдацкага экзамену. А калі ўжо быў міністрам адукацыі, знайшоў ва ўніверсітэце Аляксандра Васільевіча і шчыра падзякаваў за дапамогу ў тэарэтычным засваенні жыццёвай мудрасці.

Рэктар Бадакоў — фігура знакавая. Кіраваць Гродзенскім педінстытутам у 1973 годзе ён прыехаў з Мінска з добрым вопытам камсамольскай, навуковай і выкладчыцкай работы. Менавіта пры ім гэты педінстытут быў пераўтвораны ва ўніверсітэт — першы на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Відаць, тэма заходняга адукацыйнага бастыёна і тады хвалявала кіраўніцкі дзяржавы.

Вонкава Аляксандр Васільевіч нагадваў мне майго рэктара-настаўніка Яўгена Паўлавіча Кудрашова — строга і бездакорна апрануты, нешматслоўны, крыху аддалены, здавалася, для ўсяго, які ўжо дакладна не дазволіць ляпаць сябе па плячы. У іх падобнымі былі і развагі, і погляды на жыццё, на перамены, якія адбыліся ў краіне. Мне цікава было з ім пагаварыць — ён не навязваў свой пункт гледжання, не каментаваў змены, якія адбываюцца ў краіне, толькі адказваў на пастаўленыя пытанні. Але яго адказы былі абгрунтаванымі і мудрымі. Аляксандр Васільевіч быў дастойным прадстаўніком савецкай школы рэктараў.

**Пераклаў з рускай мовы**
**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

*(Працяг. Пачатак у нумарах за 26 сакавіка; 2, 9, 16, 23, 30 красавіка; 7, 14, 28 мая; 11 чэрвеня; 9, 16, 23, 30 ліпеня; 13, 20, 27 жніўня; 3, 17, 24 верасня; 1, 8, 15, 29 кастрычніка, 5, 12 лістапада.)*

*(Працяг будзе 3 снежня.)*

Актуальная гутарка

# Ад квантавай фізікі да Асноўнага Закона і літаратуры

**Гэтыя і іншыя пытанні абмеркавалі спікеры інфармацыйнага дня ў Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А. Куляшова старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандр Карлюкевіч і доктар педагагічных навук, палітык і пісьменнік Аляксандр Радзькоў са студэнтамі, а таксама педагагічнымі кадрамі ўстаноў адукацыі Магілёва.**




З МДУ імя А. Куляшова Аляксандр Радзькоў быў звязаны на працягу больш чым 30 гадоў: спачатку вучыўся, потым працаваў, прычым два апошнія гады перад тым, як стаць міністрам адукацыі, у якасці рэктара. Яго кніга «Фізмат» якраз пра той перыяд яго жыцця — сяброў, выкладчыкаў, усіх тых, з кім вучыўся і працаваў на фізмаце ў Магілёўскім педагагічным інстытуце, а потым — Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А. А. Куляшова. Вядомы беларускі дзеяч і палітык займаў розныя высокія пасады, але ў душы застаўся фізікам. З такога пункту гледжання ён і падзяліўся сваім поглядам на Канстытуцыю і Усебеларускі народны сход.

— Гэта ж таксама аксіяматыка, збор правілаў, якім павінны карыстацца ў жыцці ўсе: пачынаючы ад студэнта і рабочага, заканчваючы прафесарам і міністрам, — падкрэсліў ён. — Грамадства жыве і развіваецца па законах квантавай фізікі. І іх трэба глыбока вывучаць, каб выбраць асноўныя і імі кіравацца. У нас прэзідэнцкая краіна, стаўка робіцца на моцную асобу — лакаматыў, або, кажучы навуковай мовай, навуковага кіраўніка. Ён разумее, што адбываецца, ставіць задачы, дамагаецца іх выканання і ацэньвае далёкую перспектыву. Час патрабуе большага ўдзелу народа ў развіцці краіны, у прыцягненні да кіравання і рэалізацыі намечаных планаў разумных і энергічных людзей з усіх куткоў Беларусі. І гэта арганічна рэалізоўваецца праз Усебеларускі народны сход.

Якія кнігі сёння ў трэндзе, як аўтару прыцягнуць увагу чытача да свайго твора, якія тэмы ўзнімаюцца, — гэтыя і іншыя пытанні гучалі ў адрас спікераў сустрэчы. Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, а таксама дырэктар — галоўны рэдактар «Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч распавёў пра дзейнасць і асноўныя кірункі работы грамадскай арганізацыі. Сёння яна аб'ядноўвае звыш 700 чалавек. У іх ліку — шмат таленавітых маладых літаратараў, якіх ведаюць і чытаюць. Тая ж пісьменніца Ганна Чыж-Літаш у сваім тэлеграм-канале мае 11 тысяч падпісчыкаў. Сучасным класікам можна лічыць беларускага пісьменніка, крытыка, публіцыста Алеся Бадака. Яго апошні раман «Ідэальны чытач» — спалучэнне розных жанраў, што ўжо само па сабе захапляе.

Саюз пісьменнікаў робіць стаўку на дзіцячага чытача. Летась у краіне было выдадзена больш чым 9 тысяч кніг і брашур. З іх каля дзвюх тысяч — мастацкай літаратуры, 60—70 працэнтаў якой арыентавана менавіта на дзяцей і падлеткаў. У снежні бягучага года адбудзецца вялікі пленум Саюза пісьменнікаў Беларусі, які будзе прысвечаны дзіцячаму кнігавыдавецтву.

— Вельмі жывая аўдыторыя, абмеркаванне выйшла за рамкі тэмы інфармацыйнага дня, — падзяліўся сваімі ўражаннямі Алесь Карлюкевіч. — Аляксандр Міхайлавіч Радзькоў расказаў пра работу над асноўнымі пастулатамі Канстытуцыі і Усебеларускага народнага сходу. Людзі цікавяцца жывым сацыяльным фарматам — дзе, што адбываецца. І тая цікавасць добра спалучылася з размовай пра работу Саюза пісьменнікаў Беларусі. Кніга — па-ранейшаму выхавальнік і настаўнік грамадства, пра гэта казаў і Аляксандр Радзькоў. Улічваючы, што столькі пытанняў паступіла, цікавасць ёсць і да чытання, і да прасоўвання кнігі. Добра, што ў рамках універсітэта праце такі плённы творчы актыў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота Галіны ГАЎРЫЛОВІЧ.**

## Людміла САЯНКОВА-МЯЛЬНІЦКАЯ:

# «Ніколі не магла ўявіць, што менавіта гэты выкладчык стане маім лёсам»

### Загадчыца кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі факультэта журналістыкі БДУ — пра жыццёвыя эпізоды прафесара Ефрасінні Бондаравай

**УЧОРА адзначалася стагоддзе з дня нараджэння вядомага кіназнаўца, заслужанага дзеяча навукі БССР, доктара філалагічных навук Ефрасінні Бондаравай, якая стаяла каля вытокаў нацыянальнай школы беларускай кінакрытыкі. Амаль усё жыццё прафесар Бондарава прысвяціла даследаванню кінамастацтва, з'яўлялася экспертам нумар адзін у кінематографе. Адначасова Ефрасіння Леанідаўна выкладала на факультэце журналістыкі БДУ, дзе за паўвека настаўніцтва выхавала не адно пакаленне таленавітых людзей, сярод якіх — вядомыя пісьменнікі, мастацтвазнаўцы, кінарэжысёры, журналісты, навуковыя дзеячы...**

Адна з найбольш любімых вучаніц прафесара — Людміла Саянкова-Мяльніцкая — працягвае справу сваёй Настаўніцы. Людміла Пятроўна ўзначальвае кафедру літаратурна-мастацкай крытыкі факультэта журналістыкі БДУ, якая ў свой час была створана менавіта намаганнямі Ефрасінні Бондаравай. Як і яе Настаўніца, Людміла Саянкова-Мяльніцкая выдатна разбіраецца ў кінамастацтве, сваім вопытам дзеліцца са студэнтамі, да яе меркавання прыслухоўваюцца на шматлікіх кінафорумах. Людміла Пятроўна не хавае: у гэтым ёсць і заслуга Ефрасінні Бондаравай, з якой іх звязвалі вельмі блізкія адносіны. Загадчыца кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі факультэта журналістыкі БДУ расказала, якой была прафесар па-за студэнцкай аўдыторыяй, чаму да меркавання Бондаравай прыслухоўваліся самыя высокія чыноўнікі і з якой прычыны на яе занятткі любілі хадзіць усе студэнты без выключэння.

***— Лёс Ефрасінні Бондаравай быў няпросты. Ужо адно толькі тое, што яна перажыла Вялікую Айчынную, сведчыць аб яго драматычнасці. Ці расказвала Ефрасіння Леанідаўна пра вайну, або гэта была закрытая тэма?***

— Было зразумела: яна не любіць гаварыць на тую тэму. Увогуле, я заўважаю, што многія, хто прайшоў выпрабаванні ў суровыя гады вайны, не хочуць успамінаць той час. Ефрасіння Леанідаўна заўсёды шчымліва, з нейкім унутраным болем гаварыла аб браце, які загінуў у гады вайны. Сувязь з братам у яе была вельмі цесная. Ён хацеў вучыцца ў кінематаграфічнай ВНУ. Магчыма, гэта налажыла на яе адбітак. Ваенны час Бондарава ўвогуле не згадвала. Я нават неяк спрабавала задаваць пытанні на тую тэму напрамую, але адчула, што гэта вельмі няёмка для яе і непажадана. Калі б цяпер можна было з ёй пагаварыць, я, напэўна, была б больш актыўнай і настойлівай. Тады ж не стала больш стукацца ў зачыненыя дзверы. А жаданне даведацца пра яе ваенны лёс было.

***— Ефрасіння Бондарава паходзіла з простай сялянскай сям'і...***

— Паколькі дзяцей у сям'і было шмат, усё было няпроста. Фактычна яна ўсяго дабівалася сама. Тое, што Ефрасіння Леанідаўна дасягнула такой вышыні, сведчыць аб яе характары, здольнасцях. Яна вырвалася з таго асяроддзя, у якім расла. Узяла высокі бар'ер і вельмі ганарылася гэтым. Але ніколі не выхваялялася. У яе не было самалюбавання. Ефрасіння Леанідаўна ведала сабе цану, магла заходзіць у любы кабінет. Яна была чалавек смелы, прамы, адкрыты, з даволі жорсткім характарам. Не так часта сустракаеш людзей, якія табе адкрыта кажуць, што ім не падабаецца, і заяўляюць аб пэўных пазіцыях. Яна магла размаўляць з кім заўгодна, ніколі не хітрыла. Характар праявіўся ўжо тады, калі яна пачынала сваю дзейнасць на журфаку. «Мы, напэўна, з вамі не спрацуемся», — прыкладна такую фразу сказаў ёй тагачасны дэкан. На што Ефрасіння Леанідаўна адказала, што прыйшла сюды не спрацоўвацца, а працаваць. У яе заўсёды была свая пазіцыя, уласны пункт гледжання. З такімі людзьмі, вядома, не вельмі зручна. Аднак да іх звяртаюцца тады, калі неабходна зразумець, што такое праўда.

***— Практычна ўсё жыццё Ефрасіння Бондарава выкладала на журфаку. Кажуць, яе вельмі любілі студэнты...***



— Яна дабілася, каб у нас з'явіўся факультатыў «Гісторыя кінамастацтва». Гэта было не вельмі проста. І не ў плане сабраць студэнтаў. Яны якраз хадзілі. Ефрасіння Леанідаўна ўмела так выбудаваць адносіны са студэнтамі, што яны пастаянна наведвалі яе занятткі: і тыя, каму цікава, і тыя, каму не вельмі. Складанасць заключалася ў тым, што трэба было дамаўляцца з іншым корпусам, дзе меся кіназала, з кінапракатам — каб нам далі на плёнцы фільм, з кінамеханікамі — каб яны нам яго паказалі. Практычна ўсю класіку савецкага і сусветнага кіно мы паглядзелі за час факультатыўных заняткаў у кіназале геаграфічнага корпуса. Цяпер думаю, якое нам было дадзена шчасце ўбачыць у аўтэнтычнай форме кіно на вялікім экране, ды яшчэ і з каментарыем спецыяліста. Праўда, супраць таго была адміністрацыя. Лічылася, што мастацтва, культура — неабавязковыя для студэнтаў. Ефрасіння Леанідаўна была перакананая, што гэта важна. Прымушала нас пісаць, выступаць, матывавала, каб мы не баяліся выказвацца. Бондарава памятная ўсім студэнтам старэйшага ўзросту, якія прайшлі праз яе рукі. Яна сапраўды была харызматычнай асобай, якая магла падняць цэлыя аўдыторыі і павесці за сабой, перакананаўшы ў тым, што вось гэта цікава. Бондарава прыдумала альманах навуковай мастацкай творчасці студэнтаў «Аўтограф». У ім пачыналі пісаць свае першыя навуковыя або мастацкія творы людзі, якія сталі потым вядомымі пісьменнікамі і навукоўцамі, дзеячамі кіно: Іван Чыгрынаў, Алег Слука, Міхаіл Цікоцкі, Анатоль Вярцінскі, Анатоль Алай... У свой час, падчас летняй практыкі, даводзілася ўдзельнічаць у выпуску альманаха і мне. Ефрасіння Леанідаўна нярэдка арганізоўвала нам чаяванні, кавапіцці. Увогуле, падкормліванне студэнтаў было яе «фішкай». Запомнілася, як будучы студэнткай я з'ездзіла на навуковую канферэнцыю ў Кіеў. А паколькі Бондарава была маім кіраўніком, адпраўляючы, дала мне грошы на паездку. Назад тыя грошы яна потым не ўзяла.

***— Такія мацярынскія адносіны?***

— Гэта такое чалавечае, матчына, жаночае. Хоць не скажу, што Ефрасіння Леанідаўна адрознівалася асаблівай пяшчотнасцю. Аднак ёй было ўласцівае пачуццё спачування, дапамогі. Увогуле, яна была вельмі адчувальнай, хоць магла таго не паказваць. Калі мы з ёю не сыходзіліся на пэўных думках, кожны з нас выказваў свой пункт гледжання. Яна, магчыма, у больш рэзкай форме — у рэчышчы свайго ўзросту, вопыту і статусу. Пасля нашай размовы я сыходзіла вельмі засмучанай і часам нават плакала. Яна быццам бы адчувала мой стан — тэлефанавала, прасіла прабачэння. Для яе гэта не было чымсьці сорамным. І я, калі не мела рацыю, прасіла прабачэння. Мы не цягнулі крыўду праз гады.

***— Гаворачы пра Бондараву, здзіўляешся, наколькі шматпланавым быў спектр яе інтарэсаў: журналіст, кінакрытык, выкладчык... Як ёй удавалася быць паспяховай у кожнай з гэтых сфер?***

— Гэта было для яе галоўным. У жанчыны ж, акрамя працы, ёсць дом, побытавыя клопаты. Гэта яе ў меншай ступені хвалявала. Яна, вядома, вяла сваю гаспадарку як разумела, але на першым месцы ў яе быў абавязак быць выкладчыкам, глядзець кіно і пісаць аб ім. Яна жыла ў такім рытме ўвесь час, нават нягледзячы на ўзрост. Днём — занятткі на факультэце, вечарам — прагляды, якія часам былі позна. Акрамя таго, Ефрасіння Леанідаўна заўсёды ўдзельнічала ў кінематаграфічных нарадах: яна была статусным кінакрытыкам, з яе меркаваннем лічыліся. Бондарава з'яўлялася членам многіх экспертных, мастацкіх саветаў. Усюды трэба было выступаць, а значыць, рыхтавацца. Яна сапраўды паспявала і глядзець, і пісаць, і выкладаць. Яшчэ і кнігі выдавала. Калі б да Бондаравай не прыйшоў дахаты, у яе заўсёды стол быў завалены кнігамі. Сядзець і пісаць ад рукі было звычайнай для яе справай.

***— Не да кожнага прафесара студэнт можа трапіць дахаты...***

— Яна запрашала не ўсіх. Толькі блізкае кола яе студэнтаў. Мне здаецца, Бондарава нават мела патрэбу ў тым, каб мы праяўлялі да яе інтарэс неяк па-хатняму. І яна магла такі інтарэс праявіць. Напрыклад, заканчваюцца ў нас занятткі, а напярэдадзе яшчэ — прагляды, але да іх яшчэ шмат часу. У такіх выпадках Ефрасіння Леанідаўна запрашала мяне паехаць да яе дадому, каб перакусіць. Дома яна пачынала мітусіцца, нешта падагаваць, каб накарміць студэнтку. Мне здаецца, Бондарава была адзінокім чалавекам. Таму паўнавартасна рэалізоўвала сябе там, дзе шматлюдна: перад студэнтамі, гледачамі ў кіназалах або ў нейкіх абмеркаваннях.



З народным пісьменнікам Беларусі Васілём Быкавым.

***— Ефрасіння Бондарава па праве лічыцца адной з заснавальніц беларускай школы кінакрытыкі. Вы — адна з найбольш яркіх сучасных прадстаўніц гэтай школы. Ці можна сказаць, што на ваш прафесійны выбар паўплывала менавіта Ефрасіння Леанідаўна?***

— Яе асоба ў поўнай меры паўплывала на мой прафесійны выбар. Калі я паступіла на журфак, нас, студэнтаў-першакурснікаў, сабралі ў аўдыторыі і пазнаёмілі з дэканам Рыгорам Булацкім, некаторымі выкладчыкамі, сярод якіх была Бондарава. Яна, шчыра кажучы, не адрознівалася асаблівай вытанчанасцю ў адзенні. Я нават не магла падумаць, што гэта прафесар. Імідж вучонага — не пра яе. Ніколі не магла ўявіць, што менавіта гэта выкладчыца стане маім лёсам. Яна мяне заўважыла на другім курсе. Я была звычайнай глядачкай. Аднак чамусьці яна мяне вылучыла і палічыла, што далей я павінна пісаць і гаварыць пра кіно, і пачала мяне вадзіць паўсюль. Памятаю, на трэцім курсе да нас прыйшоў выкладчык, які вельмі цікава выкладаў эканоміку. Мы нічога не разумелі ў гэтым прадмеце, а раптам усё стала ясна. Я нават падумала, што гэта маё прызванне і вырашыла пісаць на эканамічную тэму. Аб гэтым паведаміла Ефрасінні Леанідаўне. Трэба было бачыць, што з ёй адбылося ў гэты момант. Яна ўся змянілася ў твары, сказала, што гэтаму не бываць, і ўсё зрабіла для таго, каб мяне перавярнуць роўна на 180 градусаў, — фактычна вызначыла мой лёс. Я ўжо выкладчык шмат гадоў, але не валодаю такой сілай уздзеяння на студэнтаў.

***— Пад кіраўніцтвам Бондаравай у выніку вы абаранілі кандыдацкую дысертацыю...***

— Пра гэта пасля заканчэння журфака я ўвогуле не думала. Насуперак волі Ефрасінні Леанідаўны я паступіла ва УДІК (Усерасійскі дзяржаўны інстытут кінематаграфіі імя Герасімава. — «**Зв.**»), скончыла яго з чырвоным дыпломам. Бондарава была задаволена, ганарылася мной. Паралельна з навучаннем яна ўсё-такі абавязала мяне пісаць кандыдацкую работу. Абаранялася я на журфаку Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта (у нас не было свайго савета). Вядома, я там нікога не ведала. Каб падтрымаць мяне, у Маскву прыехала Бондарава. Яна ўжо была не юнага ўзросту — каму пераезды даюцца лёгка. Тады я не бачыла ў гэтым нічога незвычайнага. Цяпер ацэньваю яе ўчынак. Тое, што я абараніла дысертацыю па кінакрытыцы, з'яўлялася прадметам яе гонару. Бондарава мне была дараваная як вялікае шчасце. Яна мяне ўвяла ў кіно, яна прывяла мяне на факультэт журналістыкі, пад яе кіраўніцтвам я абараніла дысертацыю, яна дала мне прафесію, якую маю.

***— Якія жыццёвыя ўрокі прафесара Бондаравай вам найбольш запомніліся, магчыма, спатрэбіліся ў жыцці?***

— Па-першае, быць сумленнай, хоць бы перад самой сабой, і адстойваць тыя рэчы, якія сувымерныя з паняццем маралі. Для яе маральная катэгорыя была вельмі важная. Яна любіла фразу Шукшына: «Маральнасць ёсць праўда». Навучылася ў Ефрасінні Леанідаўны і невераготнай працаздольнасці. Умець аддаваць сябе прафесіі і быць шчодрай у ёй, не лічачыся з уласным часам і, магчыма, здароўем, — вось яе пазіцыя. Магчыма, гэта не самая галоўная якасць, якой неабходна валодаць, але Бондарава жыла па гэтым прынцыпе. Гэта ўласціва і мне.

***— Сёння мы гаворым пра Ефрасінню Бондараву як пра легенду айчыннай журналістыкі, кінамастацтва. А ці была яна легендай пры жыцці?***

— Яна была статусным чалавекам. З ёй лічыліся. Імя Бондаравай гучала. Студэнты ведалі, хто такая Бондарава і што такое з ёй працаваць. Некаторыя калегі яе не любілі, але прыслухоўваліся да яе меркавання. Ефрасіння Леанідаўна валодала сілай, статусам, аб чым сведчыць вось які момант. Калі я была студэнткай, Дом кіно размяшчаўся ў Чырвоным касцёле. Гэта быў Дом кіно закрытага тыпу. Трапіць туды на прагляды было немагчыма, калі ў цябе няма корачкі члена Саюза кінематаграфістаў. Пра студэнтаў увогуле размовы не было. І толькі Бондарава мела права праводзіць на закрытыя прагляды студэнтаў у любой колькасці. Яна была знакавай фігурай. Аб гэтым сведчыць і тое, што менавіта ёй усесаюзнае выдавецтва «Мастацтва», якое размяшчалася ў Маскве, даручыла напісаць кнігу «Кино Советской Белоруссии». Ефрасіння Леанідаўна гучала тады ў савецкім культурным кантэксце, у беларускім кінакантэксце. Перад ёй здымалі шляпу вельмі многія чыноўнікі высокага рангу. І гэта пры тым, што яна была дастаткова прамая. Аднак за яе прамалінейнасць, часам нязручнай, адчуваліся шчырасць і жаданне дапамагчы, імкненне нешта зрабіць дзеля добрай справы.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота з архіва Людмілы САЯНКОВАЙ-МЯЛЬНІЦКАЙ.**

# ШЧЫРА, ВОСТРА І СУМЛЕННА

## Чаму Зіновій Прыгодзіч марыць пра інтэрв'ю са Скарынам і Коласам

**Стварыць партрэт вядомага чалавека словам — яркі, пазнавальны і нечаканы — удаецца не кожнаму. Не дзіва, што на прэзентацыі трохкніжжа гутарак з дзеячамі культуры «Стваральнікі» («Созидатели») у Доме літаратараў быў аншлаг... Аўтар кніг, вядомы беларускі пісьменнік, публіцыст, журналіст Зіновій Прыгодзіч і сваю вечарыну з удзелам славутых герояў яговых эсэ пабудаваў у выглядзе інтэрв'ю... А цяпер героем інтэрв'ю для чытачоў «Звязды» стане ён сам.**

**Любы партрэт пачынаюць з асновы, з грунту... Для пісьменніка яго аснова — малая радзіма. Зіновій Прыгодзіч родам з вёскі Лышча Пінскага раёна, значыць, з Палесся. А што для яго — дух Палесся? Хто ўвасобіў яго ў літаратуры?**



Фота Канстанціна ДРОБАВА.

### «Я — БАЛОТНА-ЛЯСНЫ ЧАЛАВЕК»

— Калі казаць пра Палессе ў цэлым, яго ўвасабляюць мележаўскія творы і сам Мележ. А калі пра канкрэтны куточак Палесся, наш, дык нават вядомы расійскі этнограф і фалькларыст Булгакоўскі ў кнізе «Пінчукі» адзначаў яго адметнасць. Пінчукі вылучаліся сваёй гаспадарлівасцю, і тое захавалася да гэтага часу. Калі стаў працаваць у «Звяздзе», пачаў ездзіць па розных кутках Беларусі... І не ведаў, што могуць быць такія вёскі — з раскіданымі платамі, без прысад, са смеццем на вуліцы... У нашай жа вуліцы падмяталі два разы на лета, кожны насупраць свайго дома. Былі прысады з аднаго боку і другога, ясені, бярозы. Кветак шмат... Песень... Сядзібы дагледжаныя, абгароджаныя... Ніводнай хаты з падслепаватымі акенцамі. Адна толькі, дзе жыла нейкая бедная ўдава, у яе была нават гліняная падлога. Мы як на дзіва хадзілі глядзець. Саламяныя стрэхі ўжо ў маім дзяцінстве сталі знікаць, пачаліся гонты, а пасля і шыфер.

***— Што ў вас там — пушча, балота, лес?***

— Вёска доўгая, дамоў трыста, дзве вуліцы. Адна кіламетраў пяць, другая карацейшая — гасцінец, Кацярынінскі шлях. З аднаго боку, адразу ж за сядзібамі, — балота. Пачыналася мелка, потым глыбей, глыбей і — багна. Не раз карову выцягвалі вяроўкамі.

***— Людзі танулі?***

— Не. Мы ж палешукі. Людзі хадзілі і сена касіць на тое балота, ведалі, дзе можна хадзіць... А з другога боку вёскі — лес. Так што я балотна-лясны чалавек.

***— У вайну вёска ацалела?***

— Так. Але было ўсякае. Трох чалавек расстралялі на поплаве, што хавацца ішлі. У Лагішыне, які за дзесяць кіламетраў ад нас, немцы пакінулі атрад мадзьяраў. Зверствавалі тыя мадзьяры... Ад немца часам можна было адкупіцца, адмаліцца, а ад мадзьяра — ніяк. А ў нашых лясах дзейнічала партызанская брыгада. Пад Пінск хадзілі чыгунку ўзрываць, машыны нямецкія расстрэльвалі. У Хатынічах суседніх у час партызанскай аперацыі знішчылі нямецкі гарнізон. Як па ўсёй Беларусі, у нашых мясцінах памяць пра вайну балючая.

***— А гаворка адметная?***

— Так! Тры вёскі побач, і ў кожнай — свая гаворка. У нас наката кажуць «кут», у суседняй — «кіт»... Я літаратурнай беларускай мове вучыўся ў беларускіх класікаў.

***— Жонка таксама паляшучка?***

— Мая жонка нарадзілася ў Томску. Маці яе — сібірачка, а бацька — беларус са Старадарожскага раёна. Капітан, паранены на фронце, трапіў у сібірскі шпіталь. Жончына маці была там доктарам — так і пазнаёміліся... Потым перацягнуў сям'ю на сваю радзіму. Усё свядомае жыццё жонкі прайшло тут, яна доўга працавала ў выдавецтве «Мастацкая літаратура».

***— Відаць, вы ў раённай газеце і дэбютавалі?***

— Так. Быў у нас Лагішынскі раён, я пасля школы два гады працаваў у «раёнцы». Збіраўся на журфак паступаць. А вясной паехаў у Дом адпачынку. А якраз у 1962 годзе Лагішынскі раён быў ліквідаваны. Прыязджаю з Дома адпачынку — ні раёна, ні газеты... Работнікаў паўладкоўвалі: каго — у Пінск, каго — у Бярозу... А я без работы. Але засталася яшчэ ліквідацыйная камісія на чале з сакратаром райкама партыі. Заходжу да яго: «А што мне рабіць? Красавік, а паступаць мне толькі ў жніўні». Ён кажа: «Не перажывай. Вядзі раённае радыё». І я тры месяцы там працаваў і рыхтаваўся да паступлення. Што датычыцца літаратурных талентаў, Гомельскае Палессе, мабыць, больш знакамітых імёнаў дало... Але мы, пінчукі, славімся Жэняй Янішчыц.

***— Блізка былі з ёю знаёмыя?***

— Мы сябравалі. Яе вёска і мая вёска — кіламетраў за пятнаццаць. Мы нават у адным нумары пінскай газеты «Палеская праўда» дэбютавалі. Яна — з вершам, а я — з апавяданнем. Яна яшчэ была школьніцай, а я — ужо студэнтам. Суседзямі засталіся і ў Мінску: я жыў на Пуліхава, яна — на Ульянаўскай. Працавалі ў адным Доме друку... Яна — кансультантам у «Сельскай газеце», а я — у «Звяздзе». Сваю першую аповесць я надрукаваў у «Маладосці», калі там працавала Жэня. Была такая завядзёнка: пасля публікацыі, атрымаўшы ганарар, аўтары запрашалі рэдакцыю ў рэстаран ці кафэ. Я запрасіў у кафэ «Паляўнічы». Амаль усе прыйшлі, а пасля пачосткі мы з Жэняй пайшлі пешкі дадому... Яна запрасіла да сябе, і мы да трох гадзін ночы гаварылі, Жэня чытала вершы... А колькі разам хадзілі, выступалі... Яна была вельмі шчырая, душэўная... Шкада, што абарвалася ўсё ў яе сорак гадоў.

### «ПРАТАТЫП ДОЎГА КРЫЎДЗІЎСЯ»

***— У вашай аповесці «Журба мая светлая» галоўны герой Жэня Палескі — наколькі ваша альтэр эга? Наколькі праўдзіва адноўлена ваша студэнцкае юнацтва?***

— Амаль аўтабіяграфічна. Напісаў на аснове сваіх дзённікаў, якія вёў у студэнцкія гады. Калі стаў перачытваць, падумаў, што з гэтых запісаў можа атрымацца мастацкі твор. Напісаў некалькі раздзелаў, паказаў Алесю Жуку... Ён параіў: «Працягвай, будзе чытацца». І калі я вучыўся ў Маскве, тую аповесць дарабіў. Як і ў любым творы, там ёсць тыпізацыя, выдуманыя эпізоды. Напрыклад, каб зрабіць больш драматычна, я прыдумаў, што мой герой ратуе п'янага трактарыста і сам топіцца. А ў асноўным падзеі рэальныя... Некаторыя героі сябе пазналі, хоць яны там пад іншымі імёнамі. Мікола Верас — гэта Мікалай Кернога, які быў галоўным рэдактарам «Рэспублікі», лаўрэат дзяржаўнай прэміі... Апісаны Алесь Мазур, пісьменнік з Талачына, Юра Сапажкоў, паэт, мой аднакурснік... Некаторыя пакрыўдзіліся. У аповесці згадваецца студэнт Бугаёў — гультаюга, вучыцца не хоча, толькі вечар — на танцы... Прататып доўга крыўдзіўся на мяне. Але самыя вялікія непрыемнасці напаткалі пасля аповесці пра родную вёску «Ноч перад нядзеляю». У аснову паклаў жыццё маёй мамы, маіх сястры, брата... Клубок драматычных падзей. Сястра не найлепшым чынам адносілася да маці, давяла яе да інфаркту... Хоць я і стараўся акуратна напісаць, але крыўда была... Гады два з сястрой не размаўлялі. Гэтую аповесць у вёсцы чыталі усе. Толькі перад сыходам з жыцця, летась, сястра пазваніла, каб памірыцца.

***— І як пісьменніку ў такім выпадку паступаць — рызыкаваць з некім пасварыцца, але пісаць праўду, або пазбягаць падобных сітуацый?***

— Трэба рызыкаваць. Я не магу пісаць, выдумваючы. Я магу пісаць толькі пра тое, што перажыў, асабіста назіраў. Магу дадумаць, але... Калі пачаць наноў, я ўсё адно напісаў бы тое, што напісаў. Бо я паказаў не толькі нейкія праблемы сваёй сям'і, а праблемы агульнагрмадскія. П'янства, мяшчанства, спажывальніцтва... Калі пра гэта не гаварыць, не паказваць — нашто тады ўвогуле пісаць? Некаторыя праблемы нават завастраеш... Абагульняеш вобраз, тыпізуеш — а нехта абурыцца: «Што ты на мяне навесіў? Гэтага не было!». Няма разумення асаблівасцяў літаратуры.

***— Але ж частка вашай творчасці — чыста факталогія... Вашы гутаркі-партрэты, эсэ, нарысы...***

— Там чым менш адступленняў і фантазіі, тым лепш. Дзе я часам спрабаваў дапісаць нешта ад сябе, каб узбуйніць думку, — не ўспрымаецца.

***— У кожнага журналіста свае прыёмы такой работы. Якія ўжываеце вы? Любіце правакаваць суразмоўцу? Злаваць? Бянтэжыць? Ці добразычлівай увагай выводзіце на «паток свядомасці»?***

— І тое, і тое... Ёсць людзі, якія раскрываюцца без усякіх правакацый. Проста я заўжды рыхтуюся, каб суразмоўца адчуў, што я ведаю яго творчасць, з павагай стаўлюся да яго занятку. Мікалай Яроменка-старэйшы расказваў выпадак з часоў, калі быў дырэктарам тэатра. Патэлефанавала маладая журналістка: «Я хацела б з вамі сустрэцца напярэдадні тэатральнага сезона». Ён кажа — «Калі ласка, прыходзьце». «А скажыце, дзе ваш тэатр знаходзіцца?». Яроменка кажа «Да пабачэння» і вешае трубку. Калі журналістка не ведае, дзе тэатр, што яна пра яго можа сказаць?

***— А каго з суразмоўцаў цяжэй за ўсё было разгаварыць?***

— Вельмі няўдалая сустрэча атрымалася з адной вядомай спявачкай. Я пачаў з простых пытанняў, яна абурылася, што на такія пытанні ўжо сто разоў адказвала. Я патлумачыў, што гэта не інтэрв'ю з нейкай нагоды, гэта — творчы партрэт, мне трэба ўсе жыццёвыя калізіі для паўнаты таго партрэта, не магу ж я браць з чужога інтэрв'ю... Але настрой сапсаваўся. Падчас другой сустрэчы ўжо атрымалася вельмі даверлівая, шчырая размова. Але калі занёс на вычытку, гераіня ўсё асабістае папрасіла апусціць...

***— Такое нярэдка бывае — чалавек раскрыецца, распавядзе шмат цікавага пра сябе, а потым пашкадуе... Што рабіць?***

— Выкрэсліваеш, хоць і шкада... А бывае і так. Адзін рэжысёр хораша распавядаў, я з захапленнем слухаў... Прынёс на вычытку, ён дайшоў да ўласных слоў — і на мяне: «Што вы за глупствы пішаце?» Я знямеў, хацеў сказаць, што магу запіс даць праслухаць, адзін да аднаго яго словы... «Не, я гэтага не гаварыў». І пачаў апавядаць зусім адваротнае, нават пра дзяцінства сваё. І вучыўся нават не там, дзе першы раз сказаў... І такое бывае.

### ЯК ПРАГАВАРЫЦЬ ЗАПАР ВОСЕМ ГАДЗІН І НЕ СТАМІЦЦА

***— А якая размова была самай доўгай?***

— Я звычайна сустракаюся з суразмоўцам некалькі разоў... А вось з Адамам Мальдзісам мы неяк запар прагаварылі восем гадзін. Зачапіліся за гістарычную тэму, таямніца золата Напалеона ды іншае... Кажу: «Адам Восіпавіч, можа, вы стаміліся?» У гадах жа ён быў... «Не, не, я загружаны ў іншыя дні, давай ужо дагаворым да канца!» А з Міхаілам Фінбергам наадварот было. Я зайшоў... «Паўгадзіны табе хопіць?» Я кажу: «У мяне толькі пытанняў пяцьдзясят штук». — «Як? Ты ж бачыў, у мяне людзі сядзяць! Ну, добра, давай пачнём!» І вось я пытанне — ён, як з кулямёта, адказ. Прычым я пасля амаль не правіў. І пяцьдзясят пытанняў мы «праґналі» за паўтары гадзіны. Дзеля чаго з іншым трэба было б тры дні сустракацца. Для мяне гэта стала ўрокам. Увогуле, кожны з маіх суразмоўцаў даў мне нейкі жыццёвы ўрок. Фінберг — урок вось такой арганізаванасці, сканцэнтраванасці. І я зразумеў, чаму ён змог так шмат зрабіць.

***— Вы ўваходзіце ў жыццё сваіх герояў, у кантэкст іх існавання... Уражанне, што падарожнічаеце разам па іх памятных месцах. Якое было самае незвычайнае месца гутаркі?***

— Звычайна гутарылі ў майстэрнях, у кабінетах... А вось з Марыяй Захарэвіч мы маем лецішчы ў Мядзельскім раёне і часта ездзім туды на маёй машыне. І ў дарозе шмат гаворым. Яна шмат чаго распавяла — пра сям'ю, канфлікты ў тэатры... І аднойчы я сказаў: «Ведаеце, вы так цікава мне расказваеце, я хачу дапоўніць і зрабіць гутарку». Заехалі да яе ў бацькоўскую хату... Шкада, многія эпізоды, цікавыя, драматычныя, яна потым пры вычытцы апусціла. А без драматургіі, драматызму любы твор пусты. Амаль тое ж было ў мяне з народным мастаком Паплаўскім. Ён так хораша расказваў, я запісаў яго стыль, панёс на вычытку — а ён даў жонцы чытаць. А жонка, навуковец-мастацтвазнаўца, усе жывыя дыялогі закрэсліла і перакасала навуковай мовай. Паплаўскі прынёс скрэслены матэрыял: «Прабачце, калі ласка... Паглядзіце, можа, нешта з заўваг улічыце, але ў асноўным хай будзе як было». Давялосяісці на кампраміс, нешта паправіць. Але жывыя эпізоды я пакінуў, бо без гэтага было б суха і нецікава.

***— Так, некаторыя баяцца, што бронза сатрэцца...***

— Так... Аз Паплаўскім мы сябравалі, шмат сустракаліся нефармальна. У майстэрні Савіцкага я таксама шмат бываў. Савіцкі — глыбокі чалавек, вельмі адукаваны, гісторыю ведаў... У яго ў майстэрні такая бібліятэка мелася! Часам я ішоў да яго «зверыць гадзіннікі» — параўнаць ацэнкі нейкіх падзей. У яго заўсёды было сваё меркаванне. Я многае ўвёў у нашы гутаркі — пра эстэтычнае выхаванне, маральнае выхаванне... Калі б яго праграму эстэтычнага выхавання прынялі, была б вялікая справа для нашай краіны. Шмат крытыкаваў безаблічныя мікраёны. Казаў, што архітэктура ж душу выхоўвае...

### САКРЭТЫ ЖУРНАЛІСТЫКІ І ПАДАРОЖЖА Ў ЧАСЕ

***— А з кім з мінулых стагоддзяў вы хацелі б правесці гутарку?***

— Калі я гаварыў з сынам Коласа, столькі цікавага пачуў... І я так хацеў бы сустрэцца з Якубам Коласам. Мне здаецца, многа пра што ён не сказаў, не напісаў. Міхась Канстанцінавіч расказваў, што доўгія гады бацька спаў з «трывожным чамаданчыкам» побач — кожную ноч баяўся, што прыйдуць і арыштуюць. І таму ў сваіх выказваннях быў дужа асцярожны. Напрыклад, у яго брат жыў у Амерыцы, і неблагі пісьменнік, друкаваўся пад псеўданімам — Колас пра гэта нідзе не згадваў. З Мележам хацелася б пагаварыць як паляшук з палешуком. І, каб гэта магчыма было, пагутарыў бы са Скарынам. Калі я пісаў пра Полацк, вывучаў яго біяграфію. Надзвычай цікавая постаць... Распытаць пра тую гісторыю Беларусі, якую мы не ведаем. Да нас жа даходзіць зусім мала, і тое скажонае. Усе летапісы трэба чытаць з папраўкамі, бо ўсе яны пісаліся пад нейкага заказчыка. Адзін летапіс трэба правяраць другім...

***— І, хутчэй за ўсё, мы б убачылі зусім не такога Скарыну, якога ўяўляем...***

— Можа, і так. Многае ідэалізавана... А ён жа і ў турме сядзеў, і ў асабістым жыцці калізіі... А што б ён распавёў пра Полацк таго часу! Брацкая школа, езуіцкі калегіум...

***— Можа, распавёў бы такое, што мы не змаглі б абнародаваць, каб не разбураць існуючыя міфы! Гэта датычыцца любога гістарычнага персанажа... Зрэшты, задаваць правільныя пытанні — майстэрства. Вы шмат займаецеся з будучымі журналістамі. Парайце ім, якія пытанні нельга задаваць у інтэрв'ю.***

— Па-першае — «Якія ў вас творчыя планы?» Гэта пытанне страшна не любяць публічныя людзі. Не любяць і занадта асабістых, інтымных пытанняў. Нельга ў лоб пытацца нешта накшталт «Чаму вы кінулі сваю жонку?» І што яшчэ нельга, хоць і парушаецца спрэс... Вось задаеш пытанне, а чалавек не хоча адказваць, як не адказаў падчас вечарыны Елізар'еў на маё пытанне пра сям'ю. Нельга гаварыць: «Выбачайце, але вы не адказалі на маё пытанне!» Калі хочаш пачуць адказ, зайдзі з другога боку, больш карэктна, ускосна... Але калі і тады не атрымаецца — значыць, не трэба. Вось такія тры табу... Дарэчы, зараз я рыхтую кнігу пра сакрэты журналістыкі, у аснове якой — нашы размовы з адным з найстарэйшых журналістаў Аляксандрам Градзюшкам. Кніга будзе называцца «Как слово наше отзовется. Диалоги про журналистику».

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Организатор аукциона: ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703**

**Продавец: ОАО завод «ВИЗАС», 210602, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83**

**Незавершенные производством станки, узлы станков, детали и элементы, расположенные по адресу: г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83**

| № лот | Наименование | Готовность, % | Кол-во | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Стенд для испытания шлифовальных кругов на разрыв вращением СР-400В (2 кожуха, станина и КД) | 90 | 1 | 23442,00 | 1172,10 |
| 2 | Стенд для испытания шлифовальных кругов на разрыв вращением СР-400В (кожух, станина и КД) | 70 | 1 | 18232,80 | 911,64 |
| 3 | Стенд для испытания шлифовальных кругов на разрыв вращением СР-400В (кожух, станина и КД) | 70 | 1 | 18232,80 | 911,64 |
| 4 | Стенд для испытания шлифовальных кругов на разрыв вращением СР-400В (кожух, станина и КД) | 70 | 1 | 18232,80 | 911,64 |
| 5 | Стенд для испытания шлифовальных кругов на разрыв вращением СР-400В (комплект деталей) | 50 | 6 | 78141,60 | 3907,08 |
| 6 | Приспособление для наружного круглого шлифования ВЗ-318 П17 (комплект деталей) | 90 | 1 | 12859,20 | 642,96 |
| 7 | Приспособление для наружного круглого шлифования ВЗ-318 П17 (комплект деталей) | 90 | 1 | 12859,20 | 642,96 |
| 8 | Приспособление для наружного круглого шлифования ВЗ-318 П17 (комплект деталей) | 90 | 1 | 12859,20 | 642,96 |
| 9 | Приспособление для наружного круглого шлифования ВЗ-318 П17 (комплект деталей) | 90 | 1 | 12859,20 | 642,96 |
| 10 | Приспособление для цилиндрической заточки сверл (d=3-20 мм) ВЗ-318 П10 (комплект деталей) | 70 | 5 | 11394,00 | 569,70 |
| 11 | Тиски трехповоротные ВЗ-318 П16 (комплект деталей) | 2 | 20 | 1176,00 | 58,80 |
| 12 | Присп. для заточки дисковых тверд. пил (d=200-450) по передней и задней поверхности зубьев ВЗ-318 П55 (комплект деталей) без покупных деталей | 90 | 1 | 10698,00 | 534,90 |
| 13 | Станок заточной для сверл (d=0,4-3,0 мм, настольный) ВЗ-889 (комплект деталей) | 50 | 1 | 7934,40 | 396,72 |
| 14 | Станок заточной для сверл (d=0,4-3,0 мм, настольный) ВЗ-889 (комплект деталей) | 50 | 1 | 7934,40 | 396,72 |
| 15 | Станок заточной для сверл (d=0,4-3,0 мм, настольный) ВЗ-889 (комплект деталей) | 50 | 1 | 7934,40 | 396,72 |
| 16 | Станок заточной для сверл (d=0,4-3,0 мм, настольный) ВЗ-889 (комплект деталей) | 50 | 1 | 7934,40 | 396,72 |
| 17 | Приспособление для внутреннего шлифования 3Е642Е П18 (полный комплект деталей, кроме фартун) | 90 | 1 | 11323,20 | 566,16 |
| 18 | Приспособление для внутреннего шлифования 3Е642Е П18 (полный комплект деталей, кроме фартун) | 90 | 1 | 11323,20 | 566,16 |
| 19 | Приспособление для внутреннего шлифования 3Е642Е П18 (полный комплект деталей, кроме фартун) | 90 | 1 | 11323,20 | 566,16 |
| 20 | Приспособление для внутреннего шлифования 3Е642Е П18 (полный комплект деталей, кроме фартун) | 90 | 1 | 11323,20 | 566,16 |
| 21 | Стол поворотный 3Е642Е П 30 (комплект деталей) | 15 | 12 | 8020,80 | 401,04 |
| 22 | Присп. для заточки по спирали по задней поверхности ВЗ 318 П 28 (комплект деталей) | 30 | 3 | 6912,00 | 345,60 |
| 23 | Бабка универсальная ВЗ 318 П 1 (комплект деталей) | 60 | 1 | 12916,80 | 645,84 |
| 24 | Станок заточной ВЗ 818 и 3 ящика деталей | 60 | 1 | 28240,80 | 1412,04 |
| 25 | Станок заточной ВЗ 818 и 3 ящика деталей | 60 | 1 | 28240,80 | 1412,04 |
| 26 | Станок универсально-заточной 3Е 642 (комплект деталей) | 20 | 1 | 9026,40 | 451,32 |
| 27 | Станок точильно-шлифовальный (с пылесосом, круг d=350 мм) ВЗ 879-01 (без электродвигателя) | 90 | 1 | 6110,40 | 305,52 |
